Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 4 (3908)
Панядзелак, 5 студзеня

Цана нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Х-ты камсамольскі

Для пенінскага камсамолу Беларусі сёньнешні дзень—гістарычная дата. Сёньня адкрываецца Х зьезд ЛКСМБ. Свае работы зьезд будзе праводзіць у дні, калі краіна дыктатуры пралетарыяту ўступіла ў трэці рашаючы год пяцігодкі, які «БУДЗЕ ГОДАМ НОВЫХ ДАСЯНЕНЬНЯЎ, НОВЫХ БУЙНЕЙШЫХ ПОСЬПЕХАЎ САЦЫЯЛІЗМУ Ў ЯГО БАРАЦЬБЕ З КАПІТАЛІЗМАМ».

Тыя гіганцкія задачы, якія ставіць вызначаная партыяй бальшавікоў праграма сацыялістычнага наступленьня на 1931 год, зкрэсьліць напрамак работ Х зьезду ЛКСМБ, ускладняюць на яго надзвычай вялікую адказнасьць. Х зьезд ЛКСМБ, будучы скліканым на гістарычным этапе змаганьня партыі за перамогу сацыялізму, павінен вызначыць тыя канкрэтныя шляхі, па якіх пойдзе ў трэцім годзе пяцігодкі ўдзел шырокіх камсамольскіх мас і працоўнай моладзі пад кіраўніцтвам партыі ў змаганьні за поўнае забесьпячэньне бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва.

Папярэдзіў два гады пяцігодкі на аснове ажыцьцяўленьня генэральнай лініі партыі былі пэрыядам буйных перамог УсеКП(б) па ўсім фронце сацыялістычнага будаўніцтва. За гэтыя два гады пяцігодкі адбыліся нябывалыя сацыяльна-эканамічныя зрухі ў нашай краіне. Гэты пэрыяд шпаркім разьвіцьцём сацыялістычнай індустрыі, якой належыць вядучая роля ва ўсёй народнай гаспадарцы, шпаркім разгортваньнем працэсу суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы, стварыў моцную базу для яшчэ большага павышэньня бальшавіцкіх тэмпаў сацыялістычнай рэканструкцыі, стварыў базу, на якой партыя мае магчымасьць «ЗАВЯРШЫЦЬ ПАБУДАВАНЬНЕ ФУНДАМАНТУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ СССР».

Гіганцкая роля баявога атраду Усесаюзнага пенінскага камсамолу—ЛКСМБ у змаганьні за выкананьне пяцігодкі за чатыры гады бясспрэчная. Камсамол Беларусі пад цьвёрдым і непасрэдным кіраўніцтвам КП(б)Б і па ЦК правёў ВЯЛІЗАРНУЮ РАБОТУ на ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва. Уся гэта работа, у якой гераў камсамол энтузіязмам і творчай ініцыятывай, была праклянута ва ўсім сваім зьмесьце рашучым змаганьнем за генэральную лінію партыі, супроць правых і «левых» апартуністаў, супроць права-«лявацкага» блёку і прыміранцтва да ўхілаў ад бальшэвізму.

Камсамольская арганізацыя Беларусі на фронце будаўніцтва і разьвіцьця сацыялістычнай прамысловасьці БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б, паказала сябе, як моцны, пенінска згуртаваны вакол генэральнай лініі партыі і баяздольны атрад. Мабілізуючы шырокія масы пралетарскай моладзі вакол палітычных задач партыі, камсамол на фабрыках і заводах зьявіўся ініцыятарам разгортваньня сацыялістычных мэтадаў працы, заўсёды стаяў і стаіць у першых радох барацьбітоў за высокія тэмпы ў разьвіцьці прамысловасьці. Камсамольцы заводаў і фабрык зьявіліся ініцыятарамі ў справе ўздыму сацпаборніцтва на вышэйшую ступень (ударныя брыгады, «сквозные» брыгады, вытворчыя камуны і г. д.), далі на радзе прадпрыемстваў узоры сапраўды баявой работы ў барацьбе за прамфінплян. НА ЗАВОДЗЕ «КАМУНАР» (Менск) камсамольцы зьявіліся ініцыятарамі сацпаборніцтва. На сёньнішні дзень сацыялістычным спаборніцтвам апляны ўсе камсамольцы і рабочая моладзь заводу. Першая камуна піцейнага цэху была арганізавана камсамольцамі, якія далі 42 проц. павышэньня прадукцыі насустрач кантрольным лічбам. Гэта сьвяцны ўзор творчай актыўнасьці камсамолу. Асабліва гэта актыўнасьць выразна ў апошні пэрыяд, у пэрыяд падрыхтоўкі камсамолу Беларусі да свайго Х зьезду. На тым - жа заводзе «Камунар» камсамольцы сьпіцэрнага цэху выпусьцілі 5 камплэкснабільных машын у падарунак зьезду. НА ЗАВОДЗЕ «УДАРНІК» сабрана 120 рацыяналізатарскіх прапаноў. НА «ЭНЭРГІІ» рацыяналізатарскіх прапаноў сабрана 120. Камсамольская арганізацыя ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК» арганізавала камсамольскі агрэгат і ўзяла на сябе абавязак да Х зьезду выканаць контрольныя лічбы прамфінпляну на 107 проц. Падобныя ўзоры бальшавіцкай работы мы маем і ў радзе іншых буйнейшых арганізацый камсамолу (Гомельская, Віцебская).

Работа камсамольскай арганізацыі ў галіне выкананьня задач партыі па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі даказала, што вясновая частка арганізацыі камсамолу ў аснойнай сваёй масе мабілізавана вакол ажыцьцяўленьня пёзунгу партыі аб суцэльнай калектывізацыі і на яе аснове ліквідацыі кулацтва, як клясы. Камсамол сваім непасрэдным удзелам, пад кіраўніцтвам парт'ячэек, у калгасным будаўніцтве даказаў сваю баяздольнасьць у змаганьні за лінію партыі. Камсамольскія арганізацыі вялі бязьлітаснае змаганьне з правымі «левых» антысавецкіх перагібаў, якія выходзілі ад паасобных членаў арганізацыі і нават часамі ад паасобных ячэек. Разам з тым камсамол даваў і дае бязьлітасны адпор тым апартуністам у камсамоле, якія пад націскам капіталістычных элемэнтаў капітулююць перад кулацтвам, здаюць яму баявыя клясавыя пазыцыі. Роля камсамолу ў палітычным і гаспадарчым жыцьці калгасаў вялікая. Пытаньні правядзеньня сельска-гаспадарчых кампаній (сяўба, уборка ўраджаю і г. д.), арганізацыя працы ў калгасах, барацьба за іх спэцыялізацыю, за пашырэньне плошчы тэхнічных культур, за разьвіцьцё жывёлагадоўлі—былі вузлавымі моментамі ў практычнай дзейнасьці і рабоце вясковай часткі арганізацыі. І тут мы маем сапраўды бальшавіцкія ўзоры работы. Камсамольцы зьявіліся ініцыятарамі арганізацыі брыгад, ініцыятарамі ў разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва. Так, у ЯЧЭЙЦЫ КАЛГАСУ «ПРАЎДА» (Дрысенскі раён) камсамольцы арганізавалі брыгаду з 20-ці чалавек па мапацьбе з тым, каб свачасова здаць пішкі збожжа капэрацыйным загатоўчым арганізацыям. У радзе камсамольскіх ячэек гэтага-ж раёну складзены ініцыятыўныя групы па арганізацыі калгасаў. Мы тут ня спыняемся на тэй вялізарнай рабоце камсамольскай арганізацыі, якая праведзена ў тых галінах, на якіх партыя мабілізавала ўсю ўвагу шырокіх пралетарскіх і бядняцка-сераднякіх мас сялянства. Камсамол Беларусі даў капальням Данбасу 2.000 перадавых камсамольцаў, аказаў вялікую дапамогу партыі ў справе правядзеньня такіх важнейшых палітычных кампаній, як збожжазагатоўкі, адгрузка бульбы пралетарскім цэнтрам, песазагатоўкі і інш.

ЛЕНІНСКІ КАМСАМОЛ БЕЛАРУСІ Ў АСНОЎНЫМ ЗРАБІЎ ПАВАРОТ ТВАРАМ ДА ЗАДАЧ РЭКАНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫЯДУ, вызначаных генэральнай лініяй партыі. Гэтага ня могуць бачыць толькі правыя апартуністы тыпу МІНАЕВА І БУТЫРКІНА. Гэтыя апартуністы ўзводзілі на ўвесь пенінскі камсамол нічым ня прыпрытыя, бязглуздыя паклёпы, балбочучы аб «адсутнасьці актыўнасьці ў камсамоле». Як падобна гэта «таорыйка» да балбатні підэраў права-«лявацкага» блёку Сырцова-Ламінадзэ-Шацкіна аб «прастрацыі ў рабочай клясе», як сугучна зьліваюцца паклёпы апартуністаў Бутырыных і Мінаевых на камсамол з паклёпамі права-«левых» двурушнікаў на партыю. Апартуністычная вылазка Бутырыных і Мінаевых у Ленінградзе знайшла свой водгук і ў беларускай камсамольскай арганізацыі. Сакратар Горацкага райкому камсамолу, член ЦК ЛКСМБ—ЦЕЛЯШАЎ УСТУПІЎ У ПЕРАКЛІЧКУ З ПРАВЫМІ АПАРТУНІСТАМІ З ЛЕНІНГРАДСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ. Кулацкі агент Целяшаў на пленуме ЦК камсамолу Беларусі выступіў з наклёпамі на камсамол і, паўтараючы балбатню Бутырыных і Мінаевых, заявіў: «На сёньнішні дзень мы перажываем крызіс актыўнасьці камсамольскай арганізацыі, крызіс актыву». КАМСАМОЛЬСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ НАНЕСЛА БЯЗЬЛІТАСНЫ ЎДАР ПА ВЫЛАЗЬЦІ АПАРТУНІСТА ЦЕЛЯШАВА. Усе раённыя арганізацыі адналушна і жорстка асудзілі гэта выступленьне, як яўна апартуністычнае. Адна, мы ў даным выпадку павінны ўказаць на тыя памылкі, якія ў гэтай справе (выступленьне Целяшава) былі дапушчаны ЦК ЛКСМБ і яго цэнтральным органам газэтай «Чырвоная Зьмена». У чым сутнасьць гэтых памылак? Пленум ЦК камасмолу, угледзеўшы ў выступленьні Целяшава «левы» наскок на лінію партыі, гэтым самым даў няправільную кваліфікацыю яўна апартуністычнага выступленьня Целяшава. Апрача гэтага, была дапушчана памылка ў тым, што ЦК ЛКСМБ задаволіўся яўна нездавальняючай заявай Целяшава і пакінуў яго ў складзе ЦК і на кіруючай комсамольскай рабоце замест таго, каб адразу ўжыць у адносінах да гэтага апартуніста жорсткія арганізацыйныя меры. «Чырвоная Зьмена» ня толькі моўчкі абышла целяшаўскую вылазку, але, асьвятляючы ход пленуму і кастрычніцкай канфэрэнцыі камсамолу, увесь матар'ял адносна гэтай вылазкі ня пускала ў друк да спэцыяльнай пастановы бюро ЦК камсамолу.

ЦК ЛКСМБ прызнаў свае памылкі і пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б стаў на шлях іх рашучага выпраўленьня. На гэтым канкрэтным факце апартуністычнай вылазкі Целяшава ЦК ЛКСМБ мабілізаваны шырокія масы камсамолу на змаганьне за генэральную лінію партыі, супроць правых і «левых» апартуністаў у партыі і ў камсамоле.

Камсамол Беларусі пад непасрэдным кіраўніцтвам КП(б)Б даў бязьлітасны адпор права-«лявацкаму» блёку Сырцова-Ламінадзэ—Шацкіна, мабілізаваў масы камсамолу на выкарчоўваньне правааппартуністычнай практыкі і ўсякіх скажэньняў генэральнай лініі партыі. Камсамол Беларусі стаіць на чале актыўнасьці мас рабочай, калгаснай і бядняцка-сераднякоўскай моладзі, камсамол вядзе гэту моладзь на ажыцьцяўленьне пенінскай генэральнай лініі партыі. За апошнія гады, якія прайшлі ад IX зьезду ЛКСМБ, камсамольская арганізацыя вырасла на 50 з лішкам тысяч чалавек.

У сваёй мінулай дзейнасьці камсамол Беларусі пры сваім тагачасным кіраўніцтве маў рад буйных папітычных прарываў. ГЭТЫЯ ПРАРЫВЫ ЗАКЛЮЧАЛІСЯ Ў ТЫМ, што масы камсамолу Беларусі былі слаба мабілізаваны на змаганьне з правым ухілам і прымірэнцтвам, што ў арганізацыі была недаацэнка палітычнага значэньня задач па ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі партыі і яе суставной частні—беларусізацыі і задаў змаганьня супроць беларускага нацыянал-дэмакратызму, галоўнай небясьпекі—вялікадзяржаўнага шавінізму, і шавінізмаў розных колераў, у тым што ў сваёй рабоце на вытворчасьці не скарыстаў тых магчымасьцяй, якія там былі для выкананьня задач партыі, што ЦК ЛКСМБ і кіруючыя камітэты правялі прымірэнцтва да фактаў кулацкай зямельнай палітыкі, якая праводзілася на працягу пэўнага пэрыяду. КАМСАМОЛ БЕЛАРУСІ ПРЫ ТАГАЧАСНЫМ КІРАЎНІЦТВЕ ПРАЯВІЎ НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ АДСТАВАНЬНЕ Ў ТЭМПАХ РАБОТЫ САЮЗУ АД ТЭМПАЎ І ЗАДАЧ РЭКАНСТРУКЦЫЙНАГА ПЭРЫЯДУ.

З таго часу, як выкрыты гэтыя прарывы, прайшло больш году.

Х зьезд камсамолу - павінен праверыць, як камсамольская арганізацыя ліквідавала гэтыя буйныя прарывы. Між іншым, мы хочам паказаць на адзін вучастак работы, на якім камсамольская арганізацыя ня зусім справілася са сваімі задачамі. Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б у рэзалюцыі па нацпытаньні падкрэсьліў, што «КАМСАМОЛЬСКІЯ АРГАНІЗАЦЫІ ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ РАЗГАРНУЛІ РАБОТЫ ПА ПРАВЯДЗЕНЬНІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ, АСАБЛІВА Ў СПРАВЕ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ». На гэтым пытаньні, якое зьяўляецца сустаўной часткай сацыялістычнага будаўніцтва, на пытаньні ўзмацненьня барацьбы супроць вялікадзяржаўнага расійскага шавінізму—галоўнай небясьпекі на даным этапе, супроць беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і шавінізму усіх копераў зьезд павінен мабілізаваць увагу самых шырокіх мас камсамолу рабочай і працоўнай моладзі.

За пэрыяд ад IX да сучаснага зьезду ЛКСМБ дабіўся значных посьпехаў у галіне кіраўніцтва пінэрскім рухам. Кіруемая камсамолам пінэрская арганізацыя ўзмацніла за апошні час свой удзел у сацыялістычным будаўніцтве. Аднак, дасягнутыя посьпехі ў рабоце пінэрскай арганізацыі зьяўляюцца далёка невыстарчальнымі параўнальна з тымі запатрабаваньнямі, якія стаяць перад партыяй і камсамолам.

Камсамольская арганізацыя Беларусі пад кіраўніцтвам КП(б)Б і яе ЦК прышла да свайго зьезду пенінска-згуртаваай вакол аснойных палітычных задач партыі, вакол яе генэральнай лініі. Камсамольская арганізацыя пасьля свайго зьезду яшчэ больш узмоцніць сваё змаганьне за генэральную лінію партыі супроць кулацкай агентуры—правых апартуністаў, супроць рэцыдываў контр-рэвалюцыйнага трацкізму і права-«левых» двурушнікаў і прымірэнцтва да ўхілаў ад ленінізму. Ачышчаючы свае рады ад агентаў кулацтва і ўсіх элемэнтаў, якія нездольны змагацца за лінію партыі, карыстаючыся бальшавіцкім мэтадам самакрытыкі, беларуская арганізацыя ленінскага камсамолу яшчэ больш узмоцніць сваё змаганьне за выкананьне намечанай партыяй праграмы сацыялістычнага наступленьня ў трэцім годзе пяцігодкі.

«Тыдзень Савецкай Беларусі» у Маскве

УРАЧЫСТЫ СХОД У КАМАКАДЭМІІ

Выступленьне тав. Шаранговіча

МАСКВА, 4. «Тыдзень Савецкай Беларусі» ў Маскве пачаўся з студзеня ўрачыстым сходам, наладжаным Камуністычнай Акадэміяй.

Сход адкрыў тав. Фэлікс Кон, які ад імя арганізацыйнага камітэту на правядзеньні «тыдня» ў Камакадэміі горача вітаў беларускую дэлегацыю.

— Прыезд беларускіх дэлегатаў, — сказаў ён, — зьяўляецца гістарычным момантам у жыцьці народаў Савецкага Саюзу. Калі мы гаворым аб Саюзе Савецкіх Рэспублік, дык мімаволі прыходзіць на памяць параўнаньне з тым, што робіцца на Захадзе. Там малюнак капіталістычнага сьвету, які корчыцца ў муках, беспрацоўе, голад мільённых мас, прыгнечаньне малых нацыянальнасьцяй моцнымі, пакуты тысячы турэмных вязьняў.

Тут — брацкае супрацоўніцтва ўсіх нацыянальнасьцяй, якія аддаюць усе свае сілы на будаўніцтва фундаманту сацыялістычнай эканомікі. Наш посьпех прыводзіць у трывогу і жах увесь капіталістычны сьвет. Таму апошні зноў рыхтуе супроць нас вайну і інтэрвэнцыю, зноў спускае з ланцуга сваіх васалаў.

Нельга абыйсьці моўчкі таго, што робіцца зараз у Зах. Беларусі. Там ужо зьнішчана ўсё, што носіць нацыянальны характар. Беларуская мова вытнана. У краіне лютуюць польскія карныя атрады, лепшыя сыны Зах. Беларусі пакутуюць у турмах. Сялянскія масы на грані галечы і голаду. Кастрычніцкая рэвалюцыя вызваліла Савецкую Беларусь ад гэтага лёсу. Сярод Саюзу Савецкіх Рэспублік Беларусь займае асобнае становішча. Яна зьяўляецца тым фарпостам, якому прыдзецца прыняць першы ўдар ворага.

Але мы спакойны. Мы памятаем гэраіам рабочае клясы Беларусі ў 1920 годзе ў барацьбе з белапалякамі, мы памятаем тое супрацьпаленьне, якое праяўняя Беларусі аказелі панская Польшчы. Мы ўпэўнены, што калі і надалей патрэбна будзе падтрыманьне працоўнага пасельніцтва Беларусі ў барацьбе супроць агульнага ворага, дык мы яго знойдзем. (Перапоўненая вялікая заля Камакадэміі аклаквае на гэтыя словы т. Фэлікса Кона бурнымі працяжнымі воплескамі). Палітыка савецкай улады ёсьць палітыка міру. Мір нам патрэбен, як паветра, для завяршэньня нашага вялікага будаўніцтва. Мы робім усё, каб захаваць мір. З гэтага ворагі робяць вывад, што нашы памаганьні захаваць мір выкліканы нашай слабасьцю. На Далёкім Усходзе ў часе кітайскай авантуры мы даказалі, што ёсьць яшчэ порах у савецкіх парахоўніцах (воплескі).

Сьпяхоўчыся далей на залачах «беларуская тыдню», тав. Фэлікс Кон гаворыць: «Нам трэба прыпадаць у адзей віне. Гэта некаторая «вялікарускае замкнутасьць». Мы яшчэ мала знаёмы з усімі вялізарнымі дасягненьнямі нацыянальных рэспублік, у прыватнасьці Беларусі, у галіне іх гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Між тым, многае можна было-б пераняць з вопыту дасягненьняў беларускай літаратуры і мастацтва.

У заключэньне тав. Фэлікс Кон коратка спыніўся на характарыстыцы беларускай літаратуры. Канчаючы прамову, ён сказаў: «Будзем працаваць усе разам пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі на разьвіцьцём нацыянальнай па форме і пралетарская па зьмесьце беларускай культуры».

На прапанове тав. Ф. Кона сход прасьпяваў «Інтэрнацыянал» на расійскай, беларускай, нурэйскай і польскай мовах.

* * *

З вялікім дакладам аб сацыялістычным будаўніцтве БССР выступіў сакратар ЦК КП(б)Б тав. Шаранговіч.

Ад імя рабочае клясы і працоўных Беларусі тав. Шаранговіч пералае тарачае бальшавіцкае прывітаньне працоўным Масквы і Савецкага Саюзу.

— У дарэвалюцыйны час, — гаворыць тав. Шаранговіч, — Беларусь знаходзілася на становішчы поўкалёніяльнай, эканамічна адсталай краіны. Прамысловасьць у ёй не адыгрывала ніякай ролі, сыравыя багацьці эксплёатаваліся па-драпежніцку. Сельская гаспадарка таксама была на нізкім узроўні. 44 проц. усёй зямлі належала памешчыкам, духавенству і кулаком. Асноўная-ж маса сялянства пярпела ад безьзямельля. Характэрна, што ў мінулым у такой маленькай краіне, як Беларусь, было больш за 200 тысяч батракоў. Акрамя таго, клясавыя адносіны тут перапляталіся яшчэ з нацыянальнымі, паколькі царскі ўрад усяляк імкнуўся распальваць нацыянальную рознасьць і варожасьць.

Потым Беларусь была пляцдармам імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны, якія канчаткова ўруйнавалі народную гаспадарку краіны. Такую спадчыну мы атрымалі, калі пачалі адбудоваць беларускую гаспадарку. І ўсё, што мы зараз маем, дасягнута **толькі дзякуючы правільнаму кіраўніцтву камуністычнай партыі.**

Далей, тав. Шаранговіч падае некаторыя лічбы, якія характарызуюць рост народнай гаспадаркі Савецкай Беларусі за апошнія некалькі год. **Пяцігодка беларускай прамысловасьці па ўсіх паказальніках будзе выканана ў 1931 годзе.** Вялікія сродкі ўкладаюцца ў капітальнае будаўніцтва. У 1927-28 годзе было ўкладзена **36,6 млн. рублёў**, у 1929-30 годзе — **52,3 млн.**, а ў 1930-31 г. —**190 млн. рублёў**. У Беларусі ўзьнікаюць зусім новыя галіны прамысловасьці, як, напрыклад, **тарфяная, хэмічная, мэталяапрацоўчая.** Будуецца гомельскі завод-гігант с.-г. машынабудаўніцтва, віцебскі завод, буйнейшая энэрга прадпрыемства. Будуюцца новыя шэйныя, галянтарэйныя, абутковыя, трыкатажныя фабрыкі.

Тэмпы росту народнай гаспадаркі Беларусі значна большыя, чым тэмпы росту народнай гаспадаркі СССР. Так, рост народнай гаспадаркі ў 1927-28 годзе склаў 27,1 проц., у 1928-29 г. — 49,6 проц., у 1929-30 г. — 71,8 проц., у той час, як рост народнай гаспадаркі СССР у тыя-ж гады адпаведна складаў — 23,5 проц., 20 проц. і 31 проц.

У мінулым беларускай сельскай гаспадарцы праводзілася сталыпінская сыстэма хутарскога расьсяленьня. У Савецкай Беларусі мы мелі рэцыдыў гэтай палітыкі, якая праводзілася набыўшым сумную вядомасьць былым наркамэмам БССР Прышчэпавым. Што прадстаўляе сабой прышчэпаўшчына? Паводле слоў самога Прышчэпава, яго палітыка заключалася ў тым, каб накіраваць сельскую гаспадарку Беларусі па капіталістычным шляху. Толькі ў 1928 г. пасьля выкрыцьця і разгрому прышчэпаўшчыны, мы сталі на шлях выпраўленьня ўсіх гэтых агіднасьцяй. Сельская гаспадарка Беларусі за апошнія два гады атрымала новы напрамак, асабліва ў сувязі з размахам калгаснага будаўніцтва. У апошнія паўтара-два гады пло шча саўгасаў узрасла больш, **чым у тры разы.** У сярэдзіне 1929 году мы мелі **2 проц.** калектывізаваных сялянскіх гаспадарак, у сьнежні 1930 году — **16 проц.**, да вясны 1931 г. будзем мець **30 проц.**, а ў канцы 1931 году — 45 проц. Да канца пяцігодкі мы ў галоўным закончым калектывізацыю. Размах калектывізацыі таксама значна вышэйшы ў нацыянальных раёнах — яўрэйскіх, літоўскіх.

Далей, тав. Шаранговіч спыніўся на культурных дасягненьнях Беларусі

У царскі час у Беларусі налічвалася каля 75 проц. нацыянальных школ аўсім не існавала. Выкладаньне на родной мове прасьледавалася.

Зараз мы маем вялізарны рост культурнага будаўніцтва ў БССР, асабліва ў галіне ўсеагульнага пачатковага навучаньня. Беларусь першая ўступіла на шлях усеагульнага пачатковага навучаньня. У 1929-30 г. у Беларусі было ахоплена навучаньнем **86,4 проц.** дзяцей ва ўзросьце ад 9 да 11 год. У 1931 годзе гэты процант павысіцца **да 95.** Мы маем таксама вялікі рост нацыянальнага беларускага тэатру, кіно, друку і інш.

Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне выклікала да жыцьця ў Беларусі ўсе варожыя нам сілы. На прапягу апошніх год мы маем павышаную актыўнасьць кулака, духавенства, разам з якімі выступаюць таксама выкрытыя зараз **контр-рэвалюцыянэры нацыянал-дэмакраты.** Мы зараз выкарчоўваем рэшткі нацыянал-дэмакратызму, які прабраўся амаль ва ўсе шчыліны дзяржаўнага апарату Беларусі. Беларускі нацыянал-дэмакратызм прадстаўляе сабою махровую контр-рэвалюцыйную тэорыю капіталістычнай рэстаўрацыі. Зараз ужо ўстаноўлена, што нацыянал-дэмакраты імкнуліся накіраваць нацыянальную беларускую культуру па шляху буржуазнай культуры. **Яны стварылі адзіны фронт з нацыянал-фашыстамі заграніцай, працавалі з імі заадно ў інтарэсах польскага імпэрыялізму.** Застаўшыся пасьля рэвалюцыі для работы ў савецкіх установах, яны выкарысталі аказанае ім давер'е для падрыўной работы, пры гэтым усе надзеі нацдамы ўскладалі на белую Польшчу. Зараз яны выкрыты. Дзякуючы правільнай ленінскай лініі кампартыі Беларусі, дзякуючы правільнаму вырашэньню па-ленінску нацыянальнага пытаньня, усе спробы нацыянал-дэмакратаў разьбіты ўшчэнт.

Побач з гэтым кампартыі Беларусі прышлося змагацца з усякімі ўхіламі ад ня генэральнай лініі і, акрамя таго, з мясцовым нацыянал-апартуністам. Гэту барацьбу кампартыя Беларусі вядзе рашучым чынам і цяпер. У далейшым кампартыя Беларусі таксама будзе весьці жорсткую барацьбу з усімі ўхіламі і ў першую чаргу з вялікадзяржаўным шавінізмам і мясцовым нацыянал-апартуністам. І з краіны адсталай, прынечанай, Беларусь абярнулася зараз у прамысловую, перадавую, сацыялістычную.

Посьпехі Савецкай Беларусі — прыкі ўзор для працоўных Зах. Беларусі. Яны зразумеюць, што разьвіцьцё іх краіны магчыма толькі ва ўмовах савецкай улады. Беларусь — фарпост Савецкага Саюзу ў надыходзячых баёх з капіталістычным сьветам. Беларусь гэту сваю ролю апраўдае перад рабочай клясай СССР і міжнародным пралетарыятам. (Бурныя воплескі пакрываюць апошнія словы тав. Шаранговіча).

Потым з прывітаньнямі выступілі ад прэзыдыуму Камакадэміі — **т. Остравітянаў**, ад ЦК УсеЛКСМБ—**т. Спонінскі** адзначыў, што беларускі камсамол стаіць у авангардзе ўсёй камсамольскай арміі; ад рабочых заводу «Авиоприбор» — **т. Вінакураў**, ад федэрацыі аб'яднаньня савецкіх пісьменьнікаў — **т. Селіванёўскі**, ад Камзету — **т. Мярэжкін.**

На прывітаньні адказаў удзельнік-рабочы аднаго з беларускіх заводаў тав. **Юрыс**, які сказаў прамову на беларускай мове. Ён заявіў, што пралетарыят Беларусі абяцае першым выканаць прамфінплян 1931 году і выканаць пяцігодку за чатыры гады.

У РУРЫ РАСЬЦЕ

забастовачны фронт

9 новых капалень спынілі працу

Крывавыя Цэргібелі расстрэльваюць бастуючых дэманстрантаў

ПАЛІЦЭЙСКІ ТЭРОР СУПРОЦЬ БАСТУЮЧЫХ

ПЕРШЫЯ АХВЯРЫ КРЫВАВЫХ ЦЭРГІБЕЛЯЎ

ЭСЭН, 4. На цэлым радзе рурскіх капалень сходы рабочых пастанавілі пачаць забастоўку сёньня, 5 студзеня, у капальнях «Кенігсборн», у капальнях Зудэрвіґе і інш. капальнях Рурскай вобласьці. Таксама да забастоўкі далучыўся цэнтральны завод па вырабе коксу ў Шальзэйне. Забаставалі таксама 90 проц. рабочых капалень Герынгсен. Увесь буржуазны і сацыял-дэмакратычны друк да апошняга часу з радасьцю паведамляў, што ўсе намаганьні камуністаў упягнуць рабочых гэтых капалень у забастоўку аказаліся безвыніковымі, аднак , штрэйкбрэхерскія спробы сацыял-дэмакратаў праваліліся. Нарэшце, рабочыя, якія яшчэ не далучыліся да забаставаўшых таварышоў, цяпер забаставалі ўсе да аднаго. Найбольш забастоўка пашырылася ў раёне **Дэюісбургу і Гамборну: з 16 капалень — 14 бастуюць, а з агульнага ліку рабочых 28.000 чалавек да забастоўкі далучыліся 25.000.**

У Лідфорце таго-ж раёну бастуючыя ў адказ на арышт членаў забастовачнага камітэту паладзілі грандыёзную дэманстрацыю перад будынкам паліцэйскага кіраўніцтва. Паліцыя накінулася на дэманстрантаў з выключнай жорсткасьцю і страляла на натоўпе. Забіты адзін рабочы, многа параненых. Гэта ўжо **другая ахвяра паліцэйскага тэрору ў Рурской вобласьці за час забастоўкі.** Ня гледзячы на крайнія меры паліцыі, дэманстрацыя ня спынялася да позьняга вечара.

Паліцэй-прэзыдэнт Бохума аддаў загад аб поўнай забароне якіх-бы там ні было дэманстрацый і сходаў пад адкрытым небам. Гэта забарона накіравана ў першую чаргу супроць дэманстрацыі, якая арганізуецца сёньня рэвалюцыйнай прафпазыцыяй у сувязі з канфэрэнцыяй дэлегатаў капалень, што склікаецца сёньня.

9 НОВЫХ КАПАЛЕНЬ ДАЛУЧЫЛІСЯ ДА ЗАБАСТОЎКІ

ЭСЭН, 3. Забастовачны фронт рурскіх гарнякоў сёньня раніцай пашырыўся. Апрача 31 капальні, ужо ўчора ахопленых забастоўкай, сёньня пачалася ўсеагульная або частковая забастоўка яшчэ **на 9 капальнях.** Саюз прадпрыемцаў, прызнаючы пашырэньне забастоўкі прабуе паменшыць яе разьмеры, цьвердзячы, што процант бастуючых вырас сёньня нязначна. Адначасова ў паведамленьні саюзу прадпрыемцаў зазначаецца, што капальні ў **Дэюісбургу і Гамборне** былі сёньня раніцай акружаны вялікімі масамі бастуючых. Адбылося **некальні рэзкіх сутычак з паліцыяй,** якая імкнулася разагнаць масавыя пікеты. Паліцыя, маючы загад прускага міністра ўнутраных спраў **сацыял-дэмакрата Зэвэрынга і мясцовых** улад выступаць супроць бастуючых з усёй рэзкасьцю, — ужывае зброю для абароны штрэйкбрэхераў. Ужо ёсьць ахвяры паліцэйскіх куль. У капальні Рэйнпрэсэн, каля гораду Нойкірхан, вялікі атрад паліцыі атакаваў рабочых і іх жонак, якія прымалі ўдзел у масавых пікетах. **Паліцыя страляла ў рабочых.** Забіт выпадкова прысутны чыгуначнік і паранена шмат рабочых.

АКТЫЎНЫ ЎДЗЕЛ ЖАНЧЫН У ЗАБАСТОЎЦЫ

Апрача гарнячоў прымаюць актыўны ўдзел у арганізацыі і правядзеньні забастоўкі і жанчыны. Рабочыя і жонкі гарнякоў зьбіраюцца вялікімі групамі для ўваходу ў капальні і заклікаюць вугляпоў кінуць работы і не заглядацца на скарачэньне зарплаты. Забастовачны камітэт капальні «Кенігсгрубе» склікаў мітынг жонак бастуючых вугляпоў, у якім прымала ўдзел больш за **600** жанчын. Пасьля мітынгу, на якім жанчыны абагалоцна выступалі супроць зьніжэньня зарплаты, жанчыны арганізавалі пікеты ля ўваходу ў капальні. Паліцыя, ня гледзячы на неаднаразовыя спробы, ня здолела разагнаць мітынг работніц.

ПАХОД ПРАДПРЫЕМЦАЎ НА ЗАРПЛАТУ У НЯМЕЧЧЫНЕ

БЭРЛІН, 3. У першыя-ж дні 1931 году на рабочую клясу Нямеччыны зваліліся новыя ляванні капіталістаў, якія зьніжаюць паводле патрабаваньня прадпрыемцаў зарплату рабочым, **45.000 тэкстыльшчыкам у раёне Вупэртапера зарплата зьніжана на 7 проц.** Саксонскім мэталістам — на 4-5 проц., Альтмарскім мэталістам — на 5 а паловаю проц. У самых **розастатных** галінах прамысловасьці прадпрыемцы абвяшчаюць аб ліквідаваньні дагавораў і пазьнейшай зарплаты, у прыватнасьці, прадпрыемствы сярэдня-нямецкай гарбарнай прамысловасьці, Ахэнскай тэкстыльнай прамысловасьці і абутковай прамысловасьці ўсёй Нямеччыны. У тэкстыльнай і абутковай прамысловасьці прадпрыемцы патрабуюць зьніжэньня зарплаты на **50 процантаў.**

Адначасова праўленьне дзяржаўных чыгунак абвясьціла аб звальненьні з **15 студзеня 150.000 чыгуначнікаў**, занятых у рамонтных майстэрнях і на работах на падтрыманьні ў парадку чыгуначных лініяў. Прыйшла назад рабочых праўленьне абмоўлівае згодай на скарачэньне зарплаты і агульнае пагоршаньне ўмоў працы.

Наступленьне нямецкіх прадпрыемцаў на зарплату рабочых праводзіцца з вялізарнейшай насьлядоўнасьцю. Зьніжэньне зарплаты ажыцьцяўляецца з дапамогай дзяржаўных арбітражных камісій і палягчаецца абсалютнай мажорнасьцю, а часамі і простай дапамогай рэфармісцкай прафбюракратыі. Прадпрыемцы мэталюргічнай прамысловасьці, на прыкладзе берлінскага саюзу прадпрыемцаў мэталюргічнай прамысловасьці, патрабуюць зьніжэньня зарплаты на 6—20 проц.

Мэталістам Люнэбэрскай прамысловасьці, лік якіх дасягае **120.000, зарплата зьніжана на 6 проц. У Вюртэмбэргу** заплата мэталістам скарочана: падабёная — на 5 проц., зьдзельная — **на 6 проц.** У Кельне ўсім катэгорыям мэталістаў зарплата зьніжана на 6 проц. Апрача таго, скарочан агульны лік рабочых галін у тыдзень, у выніку чаго заработак рабочых фактычна зьніжан яшчэ больш. (ТАСС).

МЭТАЛІСТЫ НІЖНЯ-РЭЙГСКАЕ АКРУГІ ПАКІНУЛІ ПРАЦУ

БЭРЛІН, 3. У Рэмшэйдзе ўчора забаставалі рабочым васьмі прадпрыемстваў мэталяпрамысловасьці. Апрача таго, на многіх прадпрыемствах рабочыя ўхвалілі пастановы абвясьціць забастоўку. У радзе іншых месц Нижня-Рэйгскае акругі таксама забаставалі рабочыя прадпрыемстваў мэталяпрамысловасьці. Забастоўкі выкліканы намерам прадпрыемцаў зьніжыць зарплату.

* * *

ЭСЭН, 3. Учора к вечару фронт бастуючых гарнякоў у Руры павялічыўся. На прадпрыемствах Дыбэрга і на прадпрыемствах Тысэна забаставалі новыя капальні, так што лік бастуючых капалень склаў 23. Апрача таго, учора днём і вечарам

К. В. Гей

КП(б)Б у барацьбе за генэральную лінію партыі

Нядаўна Савецкая Беларусь урачыста сьвяткавала дасятую гадавіну ўстанаўленьня дыктатуры пралетарыяту ў Беларусі і вызваленьня краю ад беларускай акупацыі. У гэтыя дні працоўныя масы БССР падвялі вынікі таму гіганцкаму і гэраічнаму шляху, які быў імі праароблен пад сьцягам Кастрычніка, нага ў нагу і пры бранкім палтрыманьні працоўных усяго Савецкага Саюзу; шляху, які прыведзе іх з эпохі царскага дэспатызму, памешчыцкай кабалы, капіталістычнай эксплёатацыі і нацыянальнага рабства,—у перыяд сацыялізму.

«Тыдзень Савецкай Беларусі» ў Маскве, цяперашнім чынам пераплецены з дзесяцігадовым юбілеем БССР, паціцен паказаць працоўным усяго Савецкага Саюзу твар сёньняшняй Савецкай Беларусі і дасягненьні гэтага найбольш высунутага на Захад фарпосту Савецкага Саюзу. Гэты «тыдзень» павінен стаць яркай ілюстрацыяй вялізарнай творчай магутнасьці СССР. Даваенная Беларусь была арэнай самай жорсткай памешчыцкай кабалы, найбольш драпежніцкіх форм капіталістычнай эксплёатацыі, барбарскага нацыянальнага ціску і паліцэйскага свавольства. Краіна горкай мужыцкай галечы была крыніцай вялізарнай эміграцыкай хвалі, дастаўшчыкам танпай, непатрабуючай рабочай сілы для фабрык і заводаў С.-Пецярбургу, Рыгі, Масквы, Поўдню Расіі і нават Амэрыкі.

Узровень прамысловага разьвіцьця Беларусі да вайны быў надзвычай нізкі. На 715 прадпрыемствах фабрычна-заводзкага тыпу, з якіх амаль палову складалі бровары, працавала ледзь толькі 23.000 чалавек, даючы прадукцыі на 45,4 млн. рублёў. Пераважную часьць прамысловай прадукцыі давала самагтужная прамысловасьць.

На граматнасьці Беларусь стаяла ў радзе найбольш адсталых абласьцей царскай Расіі.

Імпэрыялістычная вайна, нямецкая і польская акупацыі, выступленьні контрэвалюцыйных банд у часе грамадзянскай вайны—прывялі прамысловасьць Беларусі ў поўны заняпад. Гэты працэс быў спынен у канцы 1920 году пасьля канчатковага ўстаўленьня Савецкай улады. На тэрыторыі Заходняй Беларусі працэс руйнаваньня прамысловасьці праходзіць далей і пасьля нядоўгай перадышкі ў цяперашні час, у сувязі з эканамічным крызісам у Польшчы, адчуваецца з новай сілай.

Канец адбудоўчага перыяду ў БССР трэба аднесьці на 1927-28 гаспадарчы год, калі прамысловая прадукцыя і колькасьць занятых у прамысловасьці рабочых пераваліла за даваенны ўзровень. У першы год пяцігодкі (1928-29 г.) прамысловасьць БССР дала прадукцыі на 172,5 млн. рублёў; колькасьць рабочых узрасла да 32,4 тыс. чалавек. З яшчэ большым падёмам быў выкананы другі год пяцігодкі. Прамысловая прадукцыя дасягнула амаль 300 млн. рублёў, колькасьць рабочых пераваліла за 50 тыс. чалавек.

У асобным квартале ў рады дзейных заводаў увайшоў рад буйнейшых прадпрыемстваў: асігнаўская раённая электрастанцыя імя Сталіна, магілёўская фабрыка штучнага валакна, аршанская часальня (часьць праблізьнага камбінату), віцебская швэйная фабрыка і рад іншых, менш буйных прадпрыемстваў, якія акрэсьліваюць далейшы разгон і новыя, яшчэ больш высокія, тэмпы разьвіцьця прамысловасьці ў 1931 годзе.

Гэтыя надзвычайныя тэмпы адпаўленьня, літаральна з нічога, прамысловасьці БССР і далейшага яе разьвіцьця былі простым рэзультатам бальшавіцкай нацыянальнай палітыкі, якая цьвёрда і паўхільна праводзіцца ленінскім ЦК УсеКП(б) і пад яго кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б.

У рэзультаце рашучай барацьбы ленінскай партыі за зьнішчэньне рэштак фабрычнай няроўнасьці шляхам павышэньня эканамічнага і культурнага ўзроўню адсталых нацыянальнасьцей і рэспублік, Беларусь у галіне эканамічнай і культурнай насоўвалася наперад быстрымі крокамі, апераджаючы значна тэмпы разьвіцьця усяго Саюзу ў цэлым.

Гіганцкія тэмпы росту рабочай клясы і прамысловасьці зьяўляюцца лепшай гарантыяй рэальнасьці ўстаноўкі КП(б)Б на абкрэсьленьне БССР з краіны пераважна аграрнай у краіну індустрыяльна-калгасную. Адпак, на сёньняшні дзень, як гледзячы па гіганцкі тэмп росту ўдзельнай вагі прамысловасьці ў народнай гаспадарцы, сельская гаспадарка акрэсьлівае характар эканомікі БССР.

Пасэўныя плошчы БССР ужо ў 1924 годзе перавысілі даваенны ўзровень. Жывёлагадоўля, таксама як і асноўныя таварныя культуры (бульба, лён, сеяныя травы), дасягнулі даваеннага ўзроўню ў 1925 і часткова ў 1926 годзе. Адпак, тавараносьць сельскай гаспадаркі Беларусі, у якой пераважае дробная і найдрабнейшая сялянская гаспадарка, была нізкаватай. Нават у 1929-30 годзе каэфіцыент тавараносьці сельскай гаспадаркі ў БССР складаў ледзь толькі 12,4 проц.

Палетызацыя ў БССР да 1929 году праходзіла стыхійна, натыкаючыся на шалёнае супраціўленьне ня толькі кулацтва, але і асмельных органаў, у якіх доўгі час панавалі правыя апартуністы і прадстаўнікі контр-рэвалюцыйных груповак усіх масьцей на чале з былым наркамземам БССР Прышчэпавым. Сам Прышчэпаў сваю палітыку ў аграрным пытаньні характарызуе наступным чынам:

«Аграрная палітыка, якая праводзілася пры мне ў Беларусі, накіроўвала разьвіцьцё сельскай гаспадаркі па капіталістычным шляху. Такім чынам, гэта аграрная палітыка садзейнічала разьвіцьцю капіталізму. Такі напрамак (шлях капіталістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі ў БССР) пры маім кіраўніцтве атрымаў ся самага пачатку маёй работы ў Наркамземе пры складаньні першага пяцігадовага пляну разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР. У гэтым плане, дзе акрэсьліваліся перспэктывы разьвіцьця сельскай гаспадаркі БССР, атрымалі адлюстраваньне ідэі беларускага нацыянал-дэмакратызму».

Сутнасьць прышчэпаўшчыны лепш за ўсё выкрываюць практычныя рэзультаты гэтай палітыкі:

1) У далатак да 22 проц. сялянскіх гаспадарак, расьселеных на хутары на стальшынскім дарэвалюцыйным зямляўпарадкаваньні, было высялена на хутары яшчэ 18 проц. па прышчэпаўскім насьлядэвалюцыйным зямляўпарадкаваньні і ў сярэдзіне 1929 году хутараны складалі 40 проц. усіх сялянскіх гаспадарак.

2) Іспаналі дзьве нормы надзяльнага зямлі замкаў — максымальная і мінімальная, прычым, у распаладжэньні заможных і кулацкіх гаспадарак надзялася норма зямлі, як правіла, у два разы перавышаючая звычайнае надзяленьне сялянскіх гаспадарак.

3) Залахчовалася над любым прадпрыемам індывідуальная кулацкая гаспадарка. Калектыўныя гаспадаркі ставіліся ў горшыя ўмовы, наперакор простым дырэктывам партыі.

4) Землі саўгасаў абрэзаліся для дачы выгадных зямель хутаранцам і ў першую чаргу кулакам. Агульная плошча саўгасаў са 121.000 гэкт. у 1924 годзе скарацілася да 115.000 гэкт. у 1928 годзе. Саўгасам не аддавалася ўвага, гаспадарка вялася кепска.

5) Скарыстаньне трактараў прызнавалася неадпавядаючым умовам Беларусі. У рэзультаце трактары цяпер на 1 студзеня 1930 году налічваў усяго 200 адзінак.

6) Нарэшце, уся работа па падрыхтоўцы кадраў для сельскай гаспадаркі вялася ў напрамку падрыхтоўкі кіраўніка фармэрскай, г. зн. кулацкай гаспадаркі. Навукова-дасьледчы інстытут і сельска-гаспадарчыя ВТНУ зьяўляліся па сутнасьці праваднікамі кулацкай палітыкі. Органы Наркамазему былі засьмечаны шкодлікамі і нацыянал-дэмакратамі.

У рэзультаце рашучай барацьбы партыі з прышчэпаўшчынай і пазарэ асноўных мас сялянства на шлях сацыялістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі, мы маем рост ахопу калгасамі сялянскіх двароў з 2 проц. у сярэдзіне 1929 году да 12 проц. к канцу мая 1930 году.

Заслугоўвае ўвагі той факт, што процант ахопу калгасамі сялянскіх гаспадарак у прыгранічных раёнах вышэй сярэдняга на рэспубліцы і складае 17,4 проц. Наадварот, у раёнах найбольшага расьсяленьня на хутары ўзровень калектывізацыі ніжэйшы агульна-рэспубліканскага. Параўнальна больш шырокае распаўсюджваньне атрымліваюць у гэтых раёнах таварыствы на супольнай апрацоўцы зямлі. Рашучы ярух у галіне саўгаснага будаўніцтва быў дасягнут таксама пасьля разгрому прышчэпаўшчыны. За час з 1928 г. агульная зямельная плошча саўгасаў вырасла больш чым у тры разы і складае на 1 кастрычніка 1930 г. 379.000 гэкт., г. зн. 4.5 проц. усёй сельска-гаспадарчай тэрыторыі БССР. К канцу пяцігодкі праектуецца давесьці агульную зямельную плошчу пад саўгасамі да 800.000 гэкт.

Вялізарная работа, праведзеная партыяй на разгортваньні калгаснага і саўгаснага будаўніцтва, пасьля разгрому прышчэпаўшчыны прывяла да таго, што арамаджаны сэктар змог даць у 1930 годзе 19,7 проц. усёй валавой прадукцыі сельскае гаспадаркі і звыш 1/3 усёй таварнай прадукцыі. Такім чынам, мы атрымалі бліскучае паньвярджэньне правільнасьці ўстаноўкі ленінскай партыі ў справе вырашэньня карчовай і сырцовай праблемы.

Культурнае будаўніцтва БССР разьвіваецца яшчэ больш быстрымі тэмпамі, чым гаспадарчае будаўніцтва. На гледзячы па тое, што ў культурнай галіне контр-рэвалюцыйнымі нацыянал-дэмакратамі вялася найбольш напружаная шкодніцкая работа па падрыхтоўцы ўмоў для рэстаўрацыі капіталізму ў Беларусі, БССР мае буйнейшыя дасягненьні на шляху ліквідацыі культурнай адсталасьці, атрыманай у спадчыну ад царызму. Беларускіх школ у царскай Расіі ня было. У 1929 годзе беларускія школы складалі 90 проц., рускія—2,2 проц., яўрэйскія—4 проц., польскія—2,7 проц. і г. д. БССР ідзе першай у Саюзе па колькасным росьце пачатковых школ і першай з саюзных рэспублік уведа ўсеагульнае абавязковае навучаньне. Параўнальна з 1914 годам лічба настаўнікаў у Беларусі на даны час павялічылася ў тры разы, а лік вучняў амаль падвоіўся (з 273.000 да 518.000). Буйнейшый зрухі дасягнуты ў справе разьвіцьця сярэдняй і вышэйшай прафэсіянальнай асьветы і ў галіне масавай палітыка-асьветнай работы.

Выдавецкая прадукцыя на беларускай мове расьце праз меру быстра. За 8 месяцаў 1930 году выпушчана 26.000.000 друкаваных аркушаў на беларускай мове супроць 57.000.000 за мінулае пяцігодзьдзе (1925-1929 г.).

Усе гэтыя дасягненьні становяцца асабліва выразнымі і яркімі на фоне падзей, што маюць месца ў Зах. Беларусі: самы жорсткі паліцэйскі тэрор і нацыянальны ўціск; амаль поўная ліквідацыя беларускіх нацыянальных школ; разгром «Таварыства Беларускай Школы» і іншых культурных і асьветных беларускіх устаноў; страшэнны ямельны голад і руйнаваньне сялянскіх мас усёй сыстэмай аграрнай і падатковай палітыкі фашысцкага ўраду, накіраванай на ўмацаваньне памешчыцкай і кулацкай гаспадаркі; насаджэньне асадніцтва, дробнага памешчыка з легіянэраў Пілсудзкага; калёніяльныя формы эксплёатацыі натуральных багацьцяў Заходняй Беларусі; ўпадак прамысловасьці; паўпрыгонная шырокіх працоўных мас; сыстэматычны голад, які цягнецца засаб вось ужо шосты год у заходня-беларускай вёсцы; беспрацоўе ў гарадох.

Вядома, нацыянальны ўціск падвойвае эксплёатацыю і прынявольнае працоўных Заходняй Беларусі. Адпак, дасягненьні БССР ня трацяць яркасьці і пры параўнаньні са станам рэчаў у тых краін, якія, у рэзультаце вайны і рэвалюцыі, сталі «незалежнымі» буржуазна - імпэрыялістычнымі дзяржавамі, як: Польшча, Чэха-Славакія, Югаславія і г. д. Калі ўзяць для параўнаньня толькі адну галіну—іменна кнігавыдавецкую справу, дык па колькасьці назваў кніжная прадукцыя БССР перавышае прадукцыі ў Польшчы, у Чэха - Славакіі і ў Югаславіі. Па ліку аркушаў, выключаючы газэты і школьныя падручнікі, прадукцыя БССР, якая налічвае ледзь толькі 5.500.000 насельніцтва, большая, чым прадукцыя Польшчы, якая мае 30-мільённае насельніцтва. Тое самае і ў галіне тыражавыданьня. У той час, калі ў БССР арыгінальная і перакладная мастацкая белетрыстыка мае тыраж 3—5.000 экзэмпляраў, у Польшчы нармальным лічыцца тыраж 1—3.000 экз. Толькі панэльная, сэнсацыйна-пярнаграфічная літаратура мае тыражы, якія перавышаюць гэтыя «нармальныя» лічбы.

Дасягненьні Савецкай Беларусі зьяўляюцца рэзультатам правільнай генэральнай лініі партыі і створанага на яе аснове вялізарнага падёму актыўнасьці і рэвалюцыйнага энтузіязму рабочай клясы і асноўных сялянскіх мас. Адным з рашаючых момантаў быстрага матар'яльнага і культурнага падёму Савецкай Беларусі зьяўляецца брацкая дапамога, якую дае Беларусі Савецкі Саюз.

Нацыянальная і сацыяльная стракатасьць БССР, адносная малалікасьць пралетарыяту, адсутнасьць пралетарскіх кадраў, перавага дробна-буржуазнай стыхіі—усё гэта зьяўляецца крыніцай асабліваснэй клясавае барацьбы ў БССР. Клясавая барацьба ў БССР праяўляецца асабліва ярка ў нацыянальным пытаньні і ў пытаньнях рэлігіі (каталіцкая рэакцыя). Разгорнутае сацыялістычнае наступленьне вылікала рост супраціўленьня варожых клас. Кулацтва, якое ліквідуецца як клясу працэс разьвіцьця калектывізацыі БССР, нацыянскія элементы ў горадзе, якія выціськаюцца быстрым разьвіцьцём арамаджанага тавараазвароту, даюць адпаў контр-рэвалюцыйным групам вялікадзяржаўных рускіх шавіністаў, беларускіх нацыянал-дэмакратаў, яўрэйскіх і польскіх шавіністаў. Вялікадзяржаўныя рускі шавіністы, пагардлівыя адносіны да усяго беларускага зьяўляюцца тым сьцягам, пад якім выступаюць контр-рэвалюцыйныя элементы, у першую чаргу прадстаўнікі былых інтарэсаў раней панаваўшых у Беларусі рускіх чыноўнікаў, а таксама прадстаўляючыя інтарэсы разгромленых Кастрычнікам вялікарускіх капіталістаў і памешчыкаў. Рад шкодніцкіх груповак, у склад якіх уваходзіла пераважна руская буржуазная інтэлігенцыя, у сваіх установах на напытаньні займела поўныя вялікадзяржаўніцкія пазыцыі.

Беларускія нацыянал-дэмакраты, ідэолёгі і правадыры беларускага кулацтва, самым шалёным способам выступаюць супроць - палітыкі партыі і ў справе індустрыялізацыі БССР, і ў калектывізацыі, і ў будаўніцтве беларускай пралетарскай культуры. Рэакцыйны тэар беларускіх нацыянал-дэмакратаў, якія марзць аб рэстаўрацыі капіталізму ў Беларусі, найбольш ярка раскрываецца на прыкладзе прышчэпаўшчыны.

Ідэолёгі яўрэйскага мяшчанства, яўрэйскага вэйманства барацьбу супроць пралетарскай дыктатуры зьвялі таксама пад прыкрыцьцём нацыянальных лёзунгаў, патрабуючы, каб «іх не чапелі і далі жыць, як ім загадзае нацыянальна-рэлігійны закон». Яны выступаюць супроць яўрэйскай мовы, на якой гавораць асноўныя масы працоўных і на якой стварэцца яўрэйская пралетарская літаратура, — у абарону мёртвай старадаўняй яўрэйскай мовы. Такімі-ж лёзунгамі нацыянальнага адзінства і рэлігійнай абасобленасьці прасякнуты выступленьні прадстаўнікоў польскага кудацтва, якое пад гэтымі лёзунгамі вядзе самую шалёную барацьбу за утрыманьне свайго ўпляву на працоўныя масы польскае вёскі.

Антысэмітызм зьяўляецца яднаючай плятформай, як для вялікадзяржаўных рускіх, так і беларускіх, і польскіх шавіністаў. Усе варожыя пралетарыяту элементы без адрозьненьня нацыянальнасьці адзіным фронтам выступаюць супроць калектывізацыі, бо іменна калектывізацыя сялянскае гаспадаркі зьяўляецца найбольш магутным і рэшаючым ударам па існаваньні гэтых клас.

Пагранічнае становішча БССР, тая ліхаманкавая падрыхтоўка ваеннай інтэрвэнцыі, якую вядзе польскі фашызм, надае асобныя формы супраціўленьню кулацтва. Клясавая барацьба кулацтва часта набывае формы арганізаванага шпіянажу і простай падрыхтоўкі гаебы для дзеньняў дывэрсыйных банд і для ўвараваньня інтэрвэнтаў. Кулацкі тэрор, накіраваны супроць сельскіх актывістаў калгасьнікаў і камуністаў, карыстаецца надзвычай шырокім мэтадам пагрозы: «прыдзе польскае войска і ўсіх калгасьнікаў перавешае».

Нацыянал - дэмакраты, якія вялі шкодніцкую работу ў Наркамземе, у Наркамасьветы і сваёй штаб-кватэрай выбралі Беларускую Акадэмію Навук, вельмі многа напрацавалі над выхаваньнем сваіх кадраў праз настаўніцкія курсы. Яны ставілі стаўку іменна на настаўніцтва, кіруючыся вядомай пагаворкай, што франка - прускую вайну выйграў народны нямецкі настаўнік. І сапраўды, у 1927 годзе на чале адпаду з кулацкіх паўстаньняў, якое не ўдалося, стаяў настаўнік Дістанд — адзін з актыўнейшых слухачоў і работнікаў настаўніцка - лектарскіх курсаў у Слуцку, якія праводзіліся беларускімі нацыянал - дэмакратамі.

Аб задачах гэтых курсаў адзін з кіраўнікоў беларускага нацыянал - дэмакратызму — Чаржынскі адкрыта гаворыць, што «былі створаны кароткатэрміновыя настаўніцкія курсы (летнія) і восьмі спэцыяльныя лектарскія (зімнія) і восьмі паўкола гэтых курсаў і разгарнуў нац.-дэмакратычны «агітпроп» сваю дзейнасьць. Перад лектарамі, якія ехалі на гэтыя курсы, ставіліся агітацыйна-прапагандысцкія задачы. Найбольш «ударных» лектараў пасылаў Некрашэвіч з адных курсаў на другія, затрымліваў іх там на некалькі дзён. Прыезд такі лектар - «ударнік» на курсы, — расказвае Чаржынскі, — прачытае 3-4 лекцыі, вярнёй сказаць, агітацыйныя прамовы, распаліць нацыяналістычныя запалы сярод пэўных груп курсантаў і едзе далей».

Трэба, аднак, адзначыць, што дзейнасьць беларускіх нацыянал - дэмакратаў сустракала вельмі моцны адпор у нізох настаўніцтва.

Характэрна, што ў барацьбе супроць пралетарскай дыктатуры ўсе нацыяналізмы блёкаваліся і выступалі адзіным фронтам. Яўрэйскія шавіністы аказвалі самую прыцельскую дапамогу беларускім нацыянал - дэмакратам у справе ўкараненьня пралетарскіх і рэвалюцыйных элементаў. Меді месца элементы блёку паміж беларускімі нацыянал - дэмакратамі і вялікадзяржаўнымі рускімі шавіністамі. Некрашэвіч—адзін з правадыроў беларускага нацыянал-дэмакратызму, лёкай генэрала Бартэля, у часе акупацыі Адэсы французкім войскам, падпісваючы вернападданіцкія акты, адрасаваныя Вільгельму II і Шпэндзукану, в просьбай аб дапамозе супроць бальшавікоў, меў цясьнейшую сувязь з акадэмікамі Карскім і Платонавым, вядомымі сваёй нянавісьцю да «чужаземцаў», прыхільнікамі адзінай непадзельнай, якія адмаўлялі беларускаму народу ня толькі ў самастойным існаваньні, але нават не прызнавалі беларускай мовы. Нацыянал - дэмакрат Смоліч — адзін з натхняльгаў нацыянал - дэмакратычнай аграрнай палітыкі, правая рука Прышчэпава, знаходзіўся ў цясьнейшай ідэйнай і палітычнай сувязі з Кандрацьевым, Чаянавым і інш. Шкодніцтва «прампартыі» знаходзіла таксама сваё адлюстраваньне ў Сталіну, прычым, тут выкананцамі дырэктыў прыхільнікаў «адзінай непадзельнай» былі часамі і беларускія нацыянал - дэмакраты.

Элементы блёку паміж беларускімі нацыянал - дэмакратамі і вялікадзяржаўнымі рускімі шавіністамі не зьяўляюцца зышадковымі. Аляксандар Цьвікевіч — адзін з правадыроў беларускага нацыянал - дэмакратызму, пры савецкай уладзе, у часе царызму праводзіў ідэі чорнасотніцкага «западнорусизма», г. зн., прасьцей кажучы, падтрымліваў русыфікатарскую палітыку ў Беларусі. Лібэральная «Наша Ніва» — цэнтр груповак усіх беларускіх нацыяналістычных элементаў, у 1909 годзе высоўвала ідэю ўпарадкаваньня Расіі паводле ангельскага ўзору з тым, каб Беларусь уваходзіла ў склад Расійскай імпэрыі на такіх правах, як дамініёны уваходзяць у склад Ангельскай імпэрыі.

Толькі перамога Кастрычніцкай рэвалюцыі зрабіла беларускіх нацыянал-дэмакратаў прыхільнікамі «незалежнасьці», а далейшае ўмацаваньне дыктатуры пралетарыяту, разгортваньне сацыялістычнага наступленьня, калектывізацыі і ліквідацыя на гэтай базе кулацтва, як класы, прывялі да перамогі сярод іх пацыфіцкіх настрояў, арыентацыі на інтэрвэнцыю і акупацыі БССР фашысцкай Польшчай. Таму паміж нацыянал - дэмакратамі БССР і нацыянал - фашыстамі ў Зах. Беларусі існуе шчыльнае ідэйна сакгакт.

У жорстких схватках з клясавым ворагам сольдэска вырас і загартаваўся палітычна, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі, беларускі пралетарыят. Апіраючыся на батрацтва і беднату, а ў апошні час і на кулгасьнікаў, у саюзе з серадняком, пралетарыят Беларусі здолеў ня толькі даць адпор клясавому ворагу і інтэрвэнтам, але замацаваць пазыцыі пралетарскай дыктатуры, умацаваць фарпост Савецкага Саюзу на Заходняй граніцы з капіталістычным сьветам.

За апошні час мы маем значныя дасягненьні ў галіне карэнізацыі пралетарскага аўтыву ў Беларусі і ўзмацненьне удзельнае вагі беларускага пралетарыяту.

Перамогі рабочай клясы над клясавым ворагам былі-б яшчэ больш значнымі і рашучымі, калі-б клясавы вораг не знайшоў у партыі сваёй агентуры ў асобе правых апартуністаў, «левакоў» і нацыянал - апартуністаў. Правы апартунізм на ўмовах Беларусі амаль заўсёды супадаў з нацыянал - апартунізмам, які адлюстроўваў націск на партыю вялікадзяржаўных рускіх ці мясцовых шавіністаў. Беларускі нацыянал-апартунізм ня толькі на аграрным фронце цалкам і поўнасьцю падаўляў плятформу правага апартунізму. Прышчэпаўшчына (тое-ж самае можна знайсьці ў выступленьнях Жылуновіча і Ігнатоўскага) была прасякнута ідэямі клясавага міру. Беларускія нацыянал-апартуністы, выходзячы з тэорыі адзінай працоўнай беларускай нацыі, лічылі клясавую барацьбу «непарэзуменьнем», высоўвалі разам з Бухарыным лёзунг «обогащайтесь».

Аднак, калі правільнае цьвярджэньне, што правыя апартуністы ва ўмовах нацыянальнага перапляту зьяўляюць нацыянал - апартуністамі, якія адлюстроўваюць націск вялікадзяржаўнага ці мясцовага шавінізму, то няправільна лічыць, што нацыянал-апартунізм зьяўляецца толькі праяўленьнем правай небясьпекі. Правыя, як правіла, у нацыянальным пытаньні зьяўляюцца нацыянал - апартуністамі. Але нацыянал - апартуністы, асабліва вялікадзяржаўнага тыпу, выступаюць часта у «лявацкім» апярэньні.

Пад выглядам барацьбы за інтэрнацыяналізацыю культуры вялікадзяржаўнікі надзвычай часта ўтойвалі простую атаку на беларусізацыю, на беларускую пралетарскую культуру, на ленінскую палітыку партыі ў нацыянальным пытаньні. Нярэдка нацыянал-апартуністы, якія адлюстроўваюць націск мясцовага шавінізму, польскага, яўрэйскага і ў першую чаргу беларускага зварачаліся да маскаваньня сваёй апартуністычнай сутнасьці «левымі» фразамі. У імя «інтэрнацыяналізацыі» беларускага альфабэту, нацыянал-апартуністы выказаліся разам з беларускімі нацыянал - дэмакратамі за ўвядзеньне лацінкі, г. зн. лацінскага альфабэту, замест грамадзянскага альфабэту, прычытага ў беларускай літаратуры. Гэта паказная «інтэрнацыянальнасьць» беларускіх нацыянал - апартуністаў і нацыянал - дэмакратаў па сутнасьці прыкрывала імкненьні адрэзаць беларускія працоўныя масы ад чырвонай Масквы, не дапусьціць уплыву на гэтыя масы рускай пралетарскай культуры.

Такое-ж значэньне мае і прапаганда Прышчэпавым і іншымі нацыянал-апартуністамі і нацыянал - дэмакратамі ура - «інтэрнацыяналіцкай» ідэі федэрацыі БССР з будучай Савецкай Польшчай. Вядома, гэта прапаганда знадворку заманліва - рэвалюцыйная, на самой справе зьяўлялася замаскаванай прапагандай арыентацыі на Польшчу наогул, г. зн. на буржуазны Захад, на фашысцкую Польшчу.

Вядома, шырокую сацыяльную базу ў асобе кулацтва мае ва ўмовах БССР беларускі нацыянал - дэмакратызм. На гэтай падставе ў радох КП(б)Б адзін час панавала думка, што беларускі нацыянал - дэмакратызм для КП(б)Б зьяўляецца асноўнай небясьпекай на даным этапе. Гэты пункт погляду фактычна рэвізаваў пастановы XII зьезду РКП(б), які акрэсьліў, што галоўная небясьпека заключаецца ў вялікадзяржаўным рускім шавінізьме.

XIII зьезд КП(б)Б і Кастрычніцкі пленум ЦК КП(б)Б у поўнай згодзе з указаньнямі 16 зьезду УсеКП(б) рашуча і акрэсьлена ўказаў, што галоўнай небясьпекай на даным этапе зьяўляецца ўхіл у бок вялікадзяржаўнага рускага шавінізму, які патрабуе рэвізаваць асновы ленінскай нац. палітыкі, які пад сьцягам «інтэрнацыяналізму» прабуе працягнуць імкненьні пераважных клас панаваўшай раней вялікарускай нацыі вярнуць сабе страчаныя прывілеі. Гэты ўхіл зьяўляецца галоўнай небясьпекай на даным этапе таму, што ён жывіць нацыяналізм раней прыгнечаных нацый, асабліва ў сувязі з рэшткамі эканамічнай і культурнай няроўнасьці, якая на сёньняшні дзень яшчэ не пераможана і зьяўляецца спадчынай нацыянальнага ўціску з боку заможных клас раней панаваўшай вялікарускай нацыі. Ясна, што указаньні на вялікадзяржаўны рускі шавінізм, як галоўную небясьпеку на даным этапе, не азначаюць аслабленьня барацьбы супроць мясцовых шавінізмаў і ў першую чаргу супроць беларускага контрэвалюцыйнага нацыянал - дэмакратызму, які апіраецца на магутную клясавую базу ў асобе беларускага кулацтва.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам свайго ЦК вяла і вядзе непахісную барацьбу на два фронты супроць вялікадзяржаўнага рускага шавінізму, як галоўнай небясьпекі, і праяўленьняў мясцовага шавінізму. Аднак, барацьба супроць абнаглеўшага беларускага нацыянал-дэмакратызму і яго агентуры ў партыі —нацыянал - апартунізму шырока разгарнулася значна пазьней, чым, напрыклад, на Украіне (барацьба з шумскізмам і хвільёвізмам). Гэта тлумачылася ў значнай меры слабасьцю пралетарскай праслойкі ў карэнным актыве партыі і неперамаганьнем дробна - буржуазных перажыткаў у тэй праслойцы партыйнага актыву, якая разам з Жылуновічам і яго групай улілася ў рады КП(б)Б ў 1919 годзе, і разам з Ігнатоўскім — у 1920 годзе. Пераважная большасьць гэтых кадраў вышла з асяроддзіча нацыяналістычнай радыкальнай беларускай інтэлігенцыі, партыя вдолела ў гарне ідэйнай барацьбы пераплавіць іх у бальшавіцкі сплаў. Аддзельныя асобы засталіся на старых пазыцыях, прычым, сярод гэтых асоб меўся і яўна контра - рэвалюцыйны шлак у асобе А. Адамовіча, Баліцкага і Прышчэпава. У гэтай барацьбе КП(б)Б рашуча вытрэбіла ўсякія сьляды варожых партыі пралетарыяту шкуняй і ідэалёгічных укладаў. На апошнім пленуме ЦК КП(б)Б прынята пастанова, што прапаганда і падзяленьне нацыянал-апартуністычных поглядаў несумяшчальны з прыналежнасьцю да КП(б)Б.

КП(б)Б вяла і вядзе рашучую барацьбу ня толькі з нацыянал - апартуністымі, але і з правымі апартуністамі і з «левакамі». «Левыя» загібы асабліва шырока праяўляліся ўвесну 1930 году ў часе «галавакружэньня ад посьпехаў». У гэты час партыя і яе ЦК КП(б)Б з усёй бальшавіцкай непрымірымасьцю стала на шлях выпраўленьня дапушчаных памылак, напосьпех ўдар за ударам па гаоях «левай» фразы, на пераўгібшчыках, якія сваёй ура-рэвалюцыйнай крыклівай пілі ваду на млын кулацтва і зьяўляліся фактычна яго агентурай у радох шашай партыі.

Абнаўленьне арганскага акруговага партыкіраўніцтва, зьняцьце з работы нядзельных кіраўнікоў (тав. Вілінстовіч), абнаўленьне кіраўніцтва цэлага раду райкомаў — вось тыя арганізацыйныя мерапрыемствы, якія сьведчаць аб бязьпроць правых апартуністаў і іх «левых» саюзьнікаў.

КП(б) ня спынілася перад тым, каб злосных перагібшчыкаў, якія не хацелі прызнаць і выправіць дапушчаных імі памылак, гнаць з партыі і аддаваць пад суд (трэскія перагібшчыкі).

Партыя моцна б'е на асобных праяўленьнях правага апартунізму. Партыя дае неадкладны і руйнуючы адпор усякаму хныканьню на тэму аб «праваньні» тэмпаў (зьняцьце з работы сакратара райкому КП(б)Б — Нікіфарава). Скровь і ўсёды ў часе правядзеньня фінансавых мерапрыемстваў або ільна - абожжа - бульбазагатовак мы сустракаем факты патуранья кулаку. Кулака ня бачаць, кулака са сьвечкай шукаюць, лічаць, што кулак у іх у ранёне ўжо ліквідаваны. Затое, ня бачачы кулака, гэтыя яго абаронцы вельмі часта ўдараюць па серадняку.

Ня менш моцна партыя б'е па «левых» загібах, якія асабліва часта праяўляюцца ў галіне разгортваньня калектывізацыі, у галіне калгаснага прыліву, калі кантрольныя лічбы калектывізацыі галавацямі даводзяцца да вёскі, а часамі і нават да паасобнага сялянскага двара. Усім гэтым праяўленьням правага і «левага» апартунізму партыя дае неадкладны і руйнуючы адпор.

КП(б)Б ва ўсіх сваіх пастановах і рабоце пасьлядоўна вяжыцьцяўляе генэральную лінію партыі, правыя ўхілісты (Рыкаў, Бухарын, Томскі) і правы «лявацкі» блёк (Сырцова - Ламінадзе) былі аднадушна асуджаны ўсёй партарганізацыяй Беларусі.

У арганізацыі прыкметна павышаецца ідэйна - палітычны зьровень членаў КП(б)Б.

Вялікім дасягненьнем КП(б)Б зьяўляецца вылучэньне рабочых ад варштату на кіруючую работу. Сярод вылучэнцаў 60 проц. складаюць беларусы - рабочыя. Больш адной трэці вылучэнцаў скарыстаны на гаспадарчай рабоце, рэшта — у савецкім, партыйным (18,5 проц.) і прафэсыянальным (16 процантаў) апараце.

Адным са слабых месц у рабоце партарганізацыі КП(б)Б усё яшчэ застаецца самакрытыка. Пры агульным шырокім разгортваньні самакрытыкі, росьце рабсельскораўскага руху, росьце і ўмацаваньні друку і павышэньні яго ролі —усё яшчэ надзвычай папыраны вынадкі заціску самакрытыкі, расправы з рабселькорамі і г. д. Пры страхатасьці складу КП(б)Б, адносная моладасьці рабочых кадраў паасобныя апартуністычныя элементы знаходзяць рознастайныя шляхі і магчымасьці для арганізацыі часта ганеньня на рабселькораў. Не заўсёды на вышыні становішча ажаваюцца і партрагранізацыі. Так, у лютым - сакавіку 1930 году было зьмецена кіраўніцтва Гомэльскага акругкому, якое пайшло на поваліе ў зажымшчыкаў самакрытыкі. У гэтай справе вялікую дапамогу КП(б)Б аказала «Правда».

Увесь апошні перыяд КП(б)Б працавала ў абстаноўцы бесьперапыннай і быстра ўзрастаючай актыўнасьці рабочае клясы. Разам з усё большым вылучэньнем на першае месца пытаньняў вытворчасьці, гэта абумовіла значнае ажыўленьне і перабудову партыйнай работы на прадпрыемствах. Партыйныя ячэйкі, як правіла, сыстэматычна занімаюцца пытаньнямі вытворчасьці. У дзеі камуністаў ва ўдарництве на лепшых прадпрыемствах ахапляе ўсіх рабочых - камуністаў. Есьць, вядома, і ячэйкі, якія адстаюць, у асаблівасьці на чыгунцы. Асабліва вялікі пад'ём ударництва і сацэнаборніцтва меў месца ў верасьні мінулага году ў сувязі з вядомай алозвай ЦК УсеКП(б). Гэты пад'ём партыі ўдалося ў значнай меры замацаваць. Але ўсё-ж у партыйнай рабоце на прадпрыемствах ёсьць рад сур'ёзных недахопаў. Невыстарчальна работа з новымі кадрамі рабочых, неарганізавана партыйнае кіраўніцтва па ўдарных брыгадах, нярэдка сустракаюцца парадпасьць, іншэ-ўдарніцтва, на заўсёды партыйныя арганізацыі спраўляюцца з задачамі мабілізаваць актыўнасьць рабочых, ёсьць паасобныя вынадкі хвасьцізму і апартуністычнай практыкі.

Значна больш хваравітых зьяўшч назіраецца ў вясковых арганізацыях КП(б)Б. У радзе выпадкаў мы сустракаемся з апартуністычнай недвацэнкай работы в беднатой, адсутнасьцю барацьбы з кулацтвам, мае месца апартуністычная недвацэнка клясавай барацьбы, «у нас кулака няма», «у нас кулак ліквідаваны» (такога роду заявы вясковых камуністаў сустракаюцца даволі часта).

Барацьба супроць правага апартунізму, як галоўная небясьпека на даным этапе, барацьба супроць «лявацкіх» загібаў правага апартунізму, барацьба супроць вялікадзяржаўнага рускага шавінізму, як асноўнай небясьпекі, і супроць нацыянал - апартунізму, які адлюстроўвае націск мясцовых шавіністаў, упартая работа партыі па перабудове партработы тварам да вытворчасьці, на зьнішчэньні недахопаў партработы на прадпрыемствах, па перамаганьні хваравітых зьяўшч у вясковых партарганізацыях прывялі да значнага

Ленінскі камсамол—баявая зьмена бальшавіцкай партыі

Узмацненьнем партыйнага кіраўніцтва работай ячэек ЛКСМБ забясьпечыць і замацаваць поўны паварот камсамольскіх арганізацый тварам да задач рэканструкцыйнага пэрыяду

Бальшавіцкай зьмене—больш увагі

Камсамольская арганізацыя Беларусі падыходзіць да свайго 10-га зьезду са значнымі дасягненьнямі ў рабоце ва ўсіх галінах сацыялістычнага будаўніцтва. Камсамольская арганізацыя, працуючы пад непасрэдным кіраўніцтвам партыі, перабудавала ў асноўным сваю работу ў адпаведнасьці з задачамі індустрыялізацыі краіны, калектывізацыі сельскае гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класы на базе суцэльнай калектывізацыі.

Цэнтральнае месца ў рабоце ЛКСМБ займалі задачы мабілізацыі рабочае, батрацкае, бядняцкае і серадняцкае моладзі на ажыцьцяўленьне генэральнае лініі партыі, бязьлітаснае змаганьне ў камсамольскіх радах з правым і «левым» апартунізмам.

Найбольш паказальныя посьпехі ў рабоце камсамолу дасягнуты ў тых зьвеньнях арганізацыі, дзе гэта работа праходзіла пры неаслабным кіраўніцтве з боку партарганізацыі. І наадварот, ёсьць асобныя ячэйкі ЛКСМБ, якія стаяць у баку ад задач сацыялістычнага будаўніцтва, што тлумачыцца адсутнасьцю кіраўніцтва з боку паасобных парт'ячэек і некаторых райкомаў КП(б)Б.

Дырэктывы студзеньскага пленуму ЦК КП(б)Б аб узмацненьні парткіраўніцтва работай камсамольскай арганізацыі по ва ўсіх зьвеньнях партарганізацыі выконваюцца. Напрыклад, **Чэрвеньскі, Чачавіцкі, Халопеніцкі** і **Талачынскі** райкомы КП(б)Б за апошнее паўгодзьдзе зусім не займаліся пытаньнем стану работы ў камсамольскіх раённых арганізацыях. Некаторыя парткомы, даючы дырэктывы парт'ячэйкам аб правядзеньні гаспадарча-палітычных кампаній па вёсцы, не вызначаюць удзелу камсамолу ў іх правядзеньні. **Дубровенскі** райком КП(б)Б, абмеркаваўшы стан работы парт'ячэйкі калгасу імя Карла Маркса, дзе выявілася поўная адсутнасьць кіраўніцтва з боку парт'ячэйкі работай ячэйкі ЛКСМБ і базьдзейнасьць апошняй, не палічыў патрэбным даць дырэктывы парт'ячэйцы аб узмацненні кіраўніцтва работай камсамольскай ячэйкі ў калгасе. Кіраўніцтва работай раённых арганізацый ЛКСМБ з боку **Самахвалавіцкага, Ляднянскага, Грэскага** і іншых райкомаў заключалася толькі ў штампаваньні парадкаў дня пленумаў і канфэрэнцый камсамольскіх раённых арганізацый.

Ва многіх выпадках не праводзіцца ў жыцьцё дырэктыва партыі аб пэрыядычным скліканьні нарад партыйнаў, прымапаваных да камсамольскіх ячэек. з удзелам сакратароў ячэек ЛКСМБ для абмеркаваньня стану парт кіраўніцтва. Той факт, што парт'ядро ў ЛКСМБ за 10 месяцаў мінулага году павялічылася толькі на 159 чалавек рабочых і батракоў, таксама сьведчыць аб невыстарчальнай увазе з боку раду парт'ячэек да пытаньня росту партыі за лік камсамольцаў.

Задачы ўцягненьня рабочай і бядняцка-серадняцкай моладзі да больш актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, якое праходзіць ва ўмовах жорсткага клясавага змаганьня, патрабуюць узмацненьня парткіраўніцтва, асабліва ў вёсцы, пізавымі зьвеньнямі камсамольскай арганізацыі.

П-ка.

Выправіць

У рабоце Кармянскай раённай партарганізацыі як з боку паасобных ячэек КП(б)Б, так і самога райкому наглядзецца апартуністычная недаацэнка значэньня ролі камсамольскай арганізацыі, як дапаможніка партарганізацыі ў справе мабілізацыі працоўнай моладзі на ажыцьцяўленьне галоўнейшых задач партыі ў вёсцы.

На працягу доўгага часу амаль поўнасьцю адсутнічала парткіраўніцтва работай большасьці ячэек ЛКСМБ. У выніку такога становішча камсамольская раённая арганізацыя да гэтага часу не заняла належнага месца ў рабоце па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і правядзеньні на вёсцы гаспадарча - палітычных кампаній. З усяго складу 527 чалавек раённай арганізацыі ЛКСМБ толькі 231 чалавек знаходзіцца ў калгасах, а ўсе іншыя моцна трымаюцца за свае ўласныя дробныя гаспадаркі. Зразумела, што тая частка камсамольцаў, якая ня ўступае ў калгасы, ня можа быць начальнікам калектывізацыі, рабіць уплыў у гэтай справе на бядняцка-серадняцкую моладзь.

Тое становішча, што большасьць ячэек раённай камсамольскай арганізацыі стаяць у баку ад калгаснага руху бядняцка-серадняцкіх мас вёскі, сьведчыць аб тым, што Кармянскай партарганізацыяй не пастаўлена перад камсамолам, як галоўнейшая задача, работа па калектывізацыі, што дапамога з боку партарганізацыі адсутнічае ў справе перабудовы работы камсамолу ў адпаведнасьці з задачамі сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі і ліквідацыі кулацтва як класы на аснове суцэльнай калектывізацыі. Змаганьне з апартунізмам у радах раённай камсамольскай арганізацыі ня ўзьнята па прынцыповую палітычную вышыню. За мінулы год мелі месца нярэдкія выпадкі выхаду камсамольцаў з калгасаў. Сярод паасобных камсамольцаў былі выступленьні супроць мерапрыемстваў партыі, праяўляліся спачуваньні кулацтву, прычым гэтым праяўленьням кулацкай агентуры ў радах камсамолу не заўсёды даваўся рашучы адпор. З прычыны адсутнасьці парткіраўніцтва паасобныя ячэйкі ЛКСМБ **(Струкачоўская, Вялынцаўская, Струменская)** даведзены да развалу.

Кіраўніцтва Кармянскай партарганізацыі павінна неадкладна ўжыць адпаведныя захады для ачышчэньня камсамольскіх радоў ад апартуністычных элементаў, забясьпечыць узмацненьне парткіраўніцтва камсамолам і ўзьняцьце яго работы на вышыню палітычных задач, вызначаных партыяй на трэці год пяцігодкі.

Н.

Баявую праграму трэцяга—выканаць поўнасьцю

БАРАЦЬБА СУПРОЦЬ УХІЛАЎ АД ЛІНІІ ПАРТЫІ—ГАЛОЎНАЯ ЎМОВА ПЕРАМОЖНАГА САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА НАСТУПЛЕНЬНЯ

З разалюцыі партактыву Гомельскай арганізацыі

Заслухаўшы даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. **Шаранговіча** аб выніках сьнежаньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б), агульна-гарадзкі партактыву Гомельскай арганізацыі поўнасьцю ўхваляе пастановы пленуму і палкам да іх далучаецца.

Актыў з задаваленьнем адзначае, што работа пленуму праходзіла пад знакам разгорнутага сацыялістычнага наступленьня і непрымірымае барацьбы супроць капітуляцкіх установак правых і «левых» апартуністаў. Партыя на падставе пастановы XVI партаезду пад бальшавіцкім кіраўніцтвам свайго ленінскага ЦК дабілася рашаючых посьпехаў па ўсіх участках сацыялістычнага будаўніцтва.

Другі год пяцігодкі партыя і рабочая класа скончылі з вялізарнымі перамогамі ў галіне індустрыялізацыі краіны і калектывізацыі сельскае гаспадаркі. Сацыялістычны сэктар ужо заняў пераважнае месца ва ўсёй эканоміцы Савецкага Саюзу. Наша краіна ўступіла ў пэрыяд сацыялізму.

Сход актыву ўхваляе вызначаныя пленумам кантрольныя лічбы на 1931 год, якія накіраваны на далейшае разгортваньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Задача партарганізацыі—разгарнуць палітычна-масавую работу вакол выкананьня прамфінпляну прадпрыемствамі па новы гаспадарчы год, дабіваючыся блаямўнага выкананьня як колькасных, так і якасных паказальнікаў.

Актыў падкрэсьлівае вялізарную важнасьць вызначаных пленумам мерапрыемстваў па перабудове работы саветаў у напрамку ўзмацненьня іх ролі ў барацьбе за генэральную лінію партыі наогул.

Сход ухваляе пастанову пленуму аб вызваленьні тав. Рыкава ад абавязкаў члена Палітбюро і старшыні СНК. Актыў шле прызначэньне тав. Молатава старшынём СНК СССР, як стойкага вытрыманага ленінца, змагара за генэральную лінію партыі.

Пастановы пленуму па пытаньні работы камсамольскіх арганізацый накіраваны на кутэйшую перабудову камсамольскіх арганізацый у боку увязкі яе з задачамі выкананьня гаспадарчых плянаў і рашучага паляпшэньня рабочага забесьпячэньня.

Вырашэньне вялізарных задач сацыялістычнага будаўніцтва, пастаўленых перад партыяй і рабочай клясай на новы гаспадарчы год, патрабуе ад усёй Гомельскай арганізацыі напружэньня ўсіх сіл і энэргіі на шырокае разгортваньне актыўнасьці і творчай ініцыятывы мас праз ударніцтва і сацыялістычнае спаборніцтва і яго вышэйшыя формы—сустрэчны прамфінплян, правераччыя дзесяцідзённі «сквозные» брыгады, грамадзкія бюро і г. д.

Партыя дабілася вялізарных перамог дзякуючы не правільнай ленінскай лініі, дзякуючы тэй бязьлітаснай барацьбе, якую вяла партыя на два фронты: супроць правааапартуністычнага ухілу—галоўнай небясьпекі на даным этапе і супроць «левых» апартуністычных загібаў, супроць права-«лявацкага» блёку і прыміраньцтва да ўсякіх ухілаў. Барацьба з ухіламі ад генэральнай лініі, барацьба з нац.-апартунізмам застаецца галоўнай умовай пераможнага сацыялістычнага наступленьня. Выкананьне вялізарнае праграмы сацыялістычнага будаўніцтва, зьнішчэньне рэшткаў капіталізму і ўзмацненьне абароназдольнасьці нашай краіны патрабуе бальшавіцкага згуртаваньня радоў партыі і рабочай клясы на падставе генэральнай лініі партыі вакол яе ленінскага ЦК.

За поўнае выкананьне бальшавіцкай праграмы трэцяга году пяцігодкі!

За ўзмацненьне абароназдольнасьці краіны, пераможнага будаўніцтва сацыялізму!

За соцыялістычную пралетарскую рэвалюцыю!

Новагодні заклік да інтэрвэнцыі супроць СССР

ПАРЫЖ, 1. Асобныя газэты ў новагодніх артыкулах падводзяць вынікі мінулага году. «Тан» у перадавым артыкуле канстатуе, што 1930 год быў «змаклівым ва ўсіх адносінах». Газэта з трывогай заўважае, што нямецкая палітыка, якая імкнецца стварыць настрой вайны і споў паставіць вырашаньня ў 1919 годзе праблемы і выступленьні Мусаліні, « стварыўшыя ўражаньне спробы арганізаваць блёку дзяржаў, якія намагаюць сілы, каб спінуць «канданы вэрсальскіх дагавораў», хаця і не стваралюць непасрэдная небясьпекі, адмак, патрабуюць вялікай пільнасьці». Заклікаючы на пільнасьці, газэта падкрэсьлівае: «руская рана на баку Эўропы застаецца вялікім няшчасьцем нашае эпохі і пакуль яна не загоіцца, сьвет будзе знаходзіцца ў мітусьні і трывозе». Гэтыя радкі «Тан» зьмяўляюцца нічым іншым, як «новагоднім» заклікам да інтэрвэнцыі супроць СССР.

УСЕ СІЛЫ КАМСАМОЛУ НА АЖЫЦЬЦЯЎЛЕНЬНЕ ЛЕНІНСКАЙ НАЦПАЛІТЫКІ ПАРТЫІ

Камсамол Беларусі ў мінулым меў рад буйнейшых палітычных прарываў. Гэтыя прарывы таксама былі і ў яго ўдзеле па нацыянальна-культурным будаўніцтве. ЦК УсеЛКСМ у сваёй пастанове па дакладу Беларускай арганізацыі камсамолу асабліва падкрэсьліў, што: **«недаацэньваючы палітычнага значэньня задач беларусізацыі (ахтыў, мова і г. д.), арганізацыя прымае зусім слабы ўдзел у нацыянальна-культурным будаўніцтве, якое разгортваецца ў рэспубліцы, у барацьбе за пралетарскі зьмест нацыянальнай культуры».** ЦК асудзіў пасыўныя адносіны былога кіраўніцтва камсамолу Беларусі да раду контр-рэвалюцыйных вылазак беларускіх нацыянал-дэмакратаў, да прымірэнчых адносін да прышчапаўшчыны. Гэта ацэнка з усёй навуковай сьведчыць аб тым, што ў мінулым кіраўніцтве камсамолу ня было выразнай палітычнай лініі.

Далейшая практычная работа Беларускай арганізацыі была накіравана на ажыцьцяўленьне гэтых важнейшых пастаноў Цэнтральнага Камітэту УсеЛКСМ. Як адно з канкрэтных мерапрыемстваў па рэалізацыі гэтых пастаноў быў **праведзен трохмесячнік беларускай пралетарскай культуры,** у задачы якога ўваходзіла прыкаваць увагу усёй арганізацыі, ўзмацніць практычны ўдзел мас камсамолу ў нацыянальна-культурным будаўніцтве. За гэты пэрыяд мы маем бясспрэчна рад дадатных момантаў па ажыцьцяўленьні гэтых важнейшых задач. Аднак, «ня гледзячы на простыя ўказаньні студзеньскага пленуму (1930 г.) ЦК КП(б)В, камсамольскія арганізацыі да гэтага часу не разагнулі работы па правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі», (з пастаноў кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)В). Гэта ацэнка поўнасьцю характарызуе становішча работы камсамольскіх арганізацый, якое мы назіраем па ажыцьцяўленьні нацыянальнай палітыкі партыі.

Яшчэ ў мінулым годзе ЦК УсеЛКСМ сыгналізаваў арганізацыі аб наяўнасьці ў іхных зьвеньнях камсамолу ўплываў беларускіх нацыянал-дэмакратаў, вялікадзяржаўных шавіністаў і г. д. Гэтыя сыгналы і зараз застаюцца поўнасьцю ў моцы. Вялізарныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкай Беларусі, сацыялістычная рэканструкцыя сельскае гаспадаркі і ліквідацыя кулацтва, як класы на базе суцэльнай калектывізацыі, пабачаны росквіт і рост на базе сацыялістычнай эканомікі пралетарскай культуры—усё гэта прыводзіць у шаленства клясавых ворагаў.

Клясавы вораг імкнуўся прасякнуць у асяродзішча моладзі, скарыстаць яе для сваіх контр-рэвалюцыйных мэт. Мы маем той факт, што контр-рэвалюцыйныя беларускія нацыянал-дэмакраты з усёй сілай імкнуліся распаўсюдзіць свой уплыў на пэўныя колы моладзі. Яны **атрымалі рашучы адпор** з боку шырокіх мас прапоўнай моладзі. Але частка гнілой дробна-буржуазнай і кулацкай моладзі знаходзілася пад іх уплывам. Паасобныя зьвеньні камсамольскай арганізацыі ў тэй ці іншай меры былі таксама заражаны нацыянал-дэмакратычнымі настроямі. Вялікадзяржаўныя шавіністы тыпу праф. Крукава (які адкрыта прапагандаваў за адзіную, недзялімую матушку Расію) таксама з універсытэцкай катэдры імкнуліся распаўсюдзіць свой уплыў на моладзь.

Трэба аддаць справядлівасьць, што на нацыяналістычныя вудачкі, якія закідвалі шавіністы ў асяродзішча моладзі, іншы раз пападаліся менш устойлівыя элементы з прапоўнай моладзі і нават з паасобных зьвеньняў камсамолу. Падамо некалькі прыкладаў. Студэнт **Беларускага дзяржаўнага палітэхнікуму** ў анамімнай анкеце піша: «шматмоўнасьць зьяўляецца бічом чалавецтва, беларусізацыя зьяўляецца ня крокам наперад, а, наадварот, крокам назад у разьвіцьці культуры чалавецтва». У **Менску** пад носам камсамольскай ячэйкі і Кастрычніцкага РК ЛКСМБ вялікадзяржаўныя шавіністы (на чале з начальнікам станцыі) высунулі «тэорыю», што прычынай крушэньняў пягікоў і арываў прамфінпляну зьяўляецца беларусізацыя. У **Гомелі** нац.-дэмакраты скарысталі камсамольцаў для ўдзелу ў контр-рэвалюцыйнай п'есе «Перамена», у якой прапагандаваліся нацыянал-дэмакратычныя лёзунгі. У **Віцебску** вялікадзяржаўныя шавіністы індустрыяльна-педагагічнага інстытуту пры пасыўных адносінах камсамольскай і партыйнай ячэйкі выкрэсьлілі з праграм беларусазнаўства па матывах, што гэта, ёсьць «тэорыі нацыянал-дэмакратаў». Можна было-б прывесьці значна больш фактаў, якія характарызуюць актывізацыю вялікадзяржаўных шавіністаў і беларускіх нацыянал-дэмакратаў, а таксама шавіністаў іншых колераў, у камсамольскай арганізацыі.

Важнейшае зьвяно ў правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі—беларусізацыя—у камсамоле Беларусі пастаўлена зусім дрэнна. Тыя пазначныя посьпехі, якія ёсьць у паасобных арганізацыях камсамолу, ні ў якой меры ня могуць загладзіць тых прарываў, што ёсьць на сёнешні дзень. Асноўнае зло заключаецца ў тым, што камсамол усёй сваёй масай яшчэ не паварнуўся тварам да выкананьня гэтай важнейшай задачы. Паасобныя зьвеньні камсамолу яўна недаацэньваюць палітычнага значэньня беларусізацыі. Ёсьць факты дзяляцкага падыходу паасобных ячэек і нават райкомаў да вырашэньня гэтага пытаньня (абмежаваньне толькі пераводам на беларускую мову тэхнічнай работы ячэек, складаньне плянаў і г. д.) замест таго, каб увязаць беларусізацыю са штодзённай работай на сацыялістычным будаўніцтве.

Перад X зьездам камсамолу павінна паўстаць на ўсёй вострасьці задача нарэшце пераламу ў пытаньнях нацыянальна-культурнага будаўніцтва. Асноўнай важнейшай праблемай павінна быць—глыбокая прапрацоўка нацыянальнай палітыкі партыі ўсёй масы камсамольскае арганізацыі, увязваючы гэту работу са змаганьнем за пяцігодку за чатыры гады, якая зьяўляецца рашаючым фактарам у зьнішчэньні фактычнай эканамічнай няроўнасьці прыпечатаных да рэвалюцыі нацыянальнасьцей. Камсамол павінен абвясьціць рашучую барацьбу шаблёнтычне, якая ёсьць у паасобных арганізацыях пры правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі.

Трэба паставіць задачу ня толькі аўладаньня беларускай мовай, але і глыбокага вывучэньня эканомікі, гісторыі партыі, гісторыі рэвалюцыйнага руху і г. д. у марксыцкім разуменьні. Практычнае правядзеньне беларусізацыі павінна быць цесна ўвязана з удзелам усёй камсамольскай арганізацыі ў сацыялістычным будаўніцтве, у будаўніцтве—нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьмесьце культуры. Ажыцьцяўляючы нацыянальную палітыку партыі, камсамол павінен выкрываць і біць контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў. Адначасова камсамол павінен з усёй энэргіяй граміць праяўленьне вялікадзяржаўнага шавінізму, які прадстаўляе галоўную небясьпеку.

Абвастраньне клясавай барацьбы на ідэалёгічным фронце з усёй рашучасьцю высоўвае перад камсамольскай арганізацыяй задачу: з аднаго боку рашучы разгром чужых пралетарыяту буржуазных і шавіністычных тэорый, і з другога—узмацненьне ўдзелу і практычнай работы ў пытаньнях падрыхтоўкі пралетарскіх кадраў. Асобны пытаньнем трэба падкрэсьліць узмацненьне ўвагі камсамолу да работы навуковых арганізацый, якія рыхтуюць кадры для падрыхтоўкі кадраў.

Пытаньне карэнізацыі ахтыву таксама востра стаіць у камсамольскай арганізацыі. Гэту праблему павінен завастрыць і завострыць X зьезд ЛКСМБ.

Рэзка павінна быць пастаўлена пытаньне аб узмацненьні інтэрнацыянальнага выхаваньня і аб узмоцненьні кіраўніцтва нацыянальнымі камсамольскімі ячэйкамі. У гэтым напрамку мы праводзім надзвычай слабую работу. Ту трэба дабіцца рашучага і карэннага перадому.

Неабходна завастрыць увагу ўсёй камсамольскай арганізацыі вакол пытаньняў усеагульнага абавязковага навучаньня, вакол ліквідацыі пісьменнасьці. Пастаўленыя задачы культурнай рэвалюцыі немысьлімы без вырашэньня гэтых асноўных пытаньняў. Як важкрэтную задачу, X зьезд ЛКСМБ павінен паставіць перад сабой мабілізацыю ўсёй камсамольскай арганізацыі на поўную ліквідацыю пісьменнасьці ў 1931 годзе, на поўнае правядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Уся гэта работа павінна быць прасякнута змаганьнем як супроць правага апартунізму—галоўнай небясьпекі, так і супроць рэцыдываў трацкізму, супроць права-«лявацкага» блёку, супроць нацыянал-апартунізму. Камсамол павінен сыстэматычна ачышчаць свае рады ад тых, хто нездольны змагацца за генэральную лінію партыі.

А. Д.

Прамфінплян для кожнага рабочага

ПРАРЫВЫ НІЧОМУ НЕ НАВУЧЫЛІ

На „Дрэваапрацоўшчыку" змазалі прапрацоўку кантрольных лічбаў

Заводзкія арганізацыі перавалілі адказнасьць на рабочыя брыгады

Старыя непаладкі перайшлі ў спадчыну трэцяму году пяцігодкі

Прарыў у другім годзе пяцігодкі. Прарыў ва ўдарным квартале—праграма ня выканана на 12,63 проц. Асабліва кепска працавала лесапілка—праграма выканана ўсяго на 73 проц. Загрузка рамазьмены была толькі на 84,3 проц. Але прарывы нічому не навучылі заводзкія арганізацыі.

Гаспадарнікі тлумачаць прарыў недахватам сырцу. Так адарылася, што ў Беларусі няма лесу. Другая «аб'ектыўная» прычына—недахват спэцвопратки.

На справе зусім ня так.

Работа адміністрацыйнага апарату культае. Папрабуйце ўзяць дакладныя лічбы выкананьня плану па месяцах. Эканаміст тав. **Чмыхаў** пачне падлічваць, а потым скажа—«прыблізна».

Рабочыя, такім чынам, таксама атрымліваюць «прыблізныя» лічбы. Таму ня ведае грамадзкасьць заводу—колькі-ж было прагулаў за ўдарным кварталам, дынамікі прагулаў: павялічваюцца яны ці зьмяншаюцца.

Табэльшчык тав. **Шчамель** кажа:

— Што я, бог? Ці-ж я павінен ведаць, па якой прычыне рабочы ня прыйшоў на работу—па хваробе ці па нягрунтоўных прычынах?

Дый навошта ведаць адміністрацыі аб прычынах прагулаў? Калі рабочы ня прыйшоў на работу сёньня, яму даюць магчымасьць адпрацаваць гэты дзень заўтра. Хочаш у свой выходны дзень працаваць—калі ласка. Ня прыйшоў на першую зьмену, выходзь на другую—ніхто не забаранае.

І замест таго, каб выступіць рашуча супроць прагульшчыкаў і нядбайнасьці, работнікі заводу апраўдваюць прагульшчыкаў.

— А калі рабочы ня мог прыйсьці, напрыклад, з-за вялікага сьнегу? Дык што-ж? Ці трэба з такімі прагульшчыкамі весьці барацьбу?

***

Цікава, як на заводзе «Дрэваапрацоўшчык» прапрацавалі кантрольныя лічбы 1931 году.

Для таго, каб самім нічога не рабіць, заводзкія арганізацыі на агульным сходзе выбралі брыгады, якім даручылі прапрацаваць кантрольныя лічбы па цэхах. Кожная брыгадзе быў дан адзін з паказальнікаў плану, і гэты паказальнік брыгада павінна была прапрацаваць па ўсіх цэхах. Ня кажучы ўжо аб тым, што ў адзін цэх прыходзіла па некалькі брыгад, гэты мэтад меў і рад іншых адмоўных бакоў. Паасобныя паказальнікі прамфінпляну былі адарваны адзін ад другога, кожная брыгада павінна была азнаёміцца з унутранымі рэсурсамі кожнага цэху і г. д.

— Прапрацоўка кантрольных лічбаў дала шмат прапаноў,—кажа старшыня заўкому тав. **Кірылычык.**

— А дзе яны, як яны выкоўваюцца?

Кірылычык пачынае «зубы заговорваць», але паказаць прапановы ня можа (таму, што іх у яго і ня было).

— Мы маем дасягненьні: па лесапілку павялічэньне праграмы на 4,12 проц., па мэблевым цэху—на 7,2 проц. Лічбу зьніжэньня сабекошту павялічылі на 3 проц., прадукцыйнасьць працы—на 5 проц.,—хваліцца фабзаўком.

— Але гэта павялічэньне не далі рабочым зьнізу, а давалі вылучаным брыгадам. На агульных сходах рабочыя галасавалі за гатовыя лічбы. Што датычыць унутраных рэсурсаў, дык яны нават часткова ня выяўлены.

Калі запытаць у кіраўнікоў—ці даведзен прамфінплян да кожнага рабочага, яны скарыстаюць усе запасы красамоўства, каб даказаць тое, чаго на справе няма.—«Плян у нас даведзен да рабочага шляхам выпіскі нарадаў»,—кажуць кіраўнікі заводу. Між тым, у нарадах паказаны толькі нормы, якія не адпавядаюць патрабаваньням прамфінпляну. А свайго прамфінпляну рабочыя ня ведаюць.

«Мая справа выканаць норму; калі я прыходжу на работу, майстар ставіць на працу, потым выпісвае нарад. Я НЯ ВЕДАЮ, ВЫКОНВАЮ СВОЙ ПЛЯН, ЦІ НЕ. Ня ведаю таксама, ЦІ ЗАБЯСЬПЕЧВАЕ МАЯ НОРМА ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ.

Наш цэхпрафкамітэт кепска працуе. У брыгадах няма сходаў, няма нарад, брыгада звычайна прымушана чакаць цэхавага сходу, каб выкрыць прагульшчыка або гультая. А начныя зьмены нават зусім не абслугоўваюцца».

Рабочы зборачнага цэху **Дамініікоўскі.**

А вось і думка другога рабочага, актыўнага ўдарніка зборачнага цэху, тав. **Екельчыка П.** На пытаньне—ці ведае ён пра свой прамфінплян, ён адказвае:

«Да сёньняшняга дня ня ведаю, бо ня меў магчымасьці быць на сходзе, на якім абгаворваўся прамфінплян. Але я пастараюся даведацца ў загадчыка цэхам, ён напэўна ведае аб маім пляне. Я толькі чуў, быццам нам расцэнкі павялічылі. Праўда, ці не—ня ведаю».

Падобныя адказы даюць і многія іншыя рабочыя. Але і прыведзеных даволі, каб сказаць, што **заводзкія арганізацыі прамфінпляну да варштату не давялі.**

***

Партыйная і прафсаюзная работа на заводзе да гэтага часу не перабудавана. Скажэнне гэта старшыні заўкому і сакратару парт'ячэйкі—яны вельмі вызіваюцца. Як гэта? Ці-ж мы не арганізавалі цэхавых партыйных і прафкамітэтаў?

А тое, што нізавымі зьвеньнямі—ударнымі брыгадамі—кіруе толькі старшы брыгадзір, што **ударныя брыгады ня маюць ні партыйных, ні прафсаюзных арганізатараў**—гэта «дробязь». Тое, што цэхавыя прафсаюзныя і партыйныя арганізацыі **не дапамагаюць цэхавай адміністрацыі**—гэта таксама «дробязь»...

— Я колькі раз прасіў цэхавыя арганізацыі стварыць грамадзкую думку вакол прагульшчыкаў, нічога не дапамагае,—кажа загадчык зборачнага цэху тав. **Кісель.**

Бязьдзейнасьць заводзкіх арганізацый у справе прапрацоўкі дырэктывы аб дзінапачальні відна з многіх фактаў. Непадпарадкаваньне майстроў з боку рабочых на заводзе звычайнае зьявішча. Ёсьць выпадкі, калі да гэтага прымешваюцца праявы антысэмітызму. Тыднём тры таму назад рабочы Русакоў пабіў майстра Яўрэя Гецава толькі за тое, што зрабіў Русакову заўвагу—не даваць браку. На такім выпадку антысэмітызму і падрыву аўтарытэту майстра трэба было завастрыць увагу заводзкага калектыву. А што зрабілі цэхавыя арганізацыі? На сваім пасяджэньні цэхпрафкамітэт механічнага цэху даў Русакову вымову, а майстру Гецаву **паставіў на від** тое, што ён да Русакова «прыставаў» (?).

У агульна-заводзкім масштабе гэта справа яшчэ ня разглядалася, ня гледзячы на тое, што прайшло шмат часу.

Работніца **Собалева** адказвае на распараджэньне майстра Рубенчыка антысэмітыкам лаянкай і атрымлівае за гэта толькі вымову.

***

Прайшоўшы з намесьнікам старшыні заўкому тав. Екельчыкам па ўсіх цэхах, мы зайшлі ў ленкуток. Праз хвілін 10 прыйшлі рабочыя першай зьмены. Сабралося каля 30 чал. І кожны з іх расказаў аб недахопах, якія не даюць магчымасьці выконваць прамфінплян. Адразу было відаць, што **ўсе недахопы мінулага году перайшлі ў спадчыну трэцяму году пяцігодкі.**

Майстар мэханічнага цэху тав. **Гітлін** скардзіцца на цэхпрафкамітэт.

«Ён зусім не дапамагае. Быў выпадак, калі на польскае сьвята ня вышлі на работу некалькі рабочых. Я прасіў, каб ім растлумачылі сутнасьць рэлігійных сьвят, а таксама мабілізаваць масы на выкананьне пляну. На гэта махнулі рукой. Вось хутка капяды і зноў будуць прагулы».

Улік браку, прастояў не вядзецца.

Рабочы тав. **Мінкін** прапануе:

«Прамфінплян трэба зараз-жа давесьці да варштату. ТРЭБА ДАВЕСЬЦІ НЯ ТОЛЬКІ КОЛЬКАСНЫЯ ПАКАЗАЛЬНІКІ, АЛЕ І ЯКАСНЫЯ, І брак, і прастоі. Толькі тады можна будзе выканаць прамфінплян і ЛІКВІДАВАЦЬ НАШУ ЗАПАЗЫЧАНАСЬЦЬ ДЗЯРЖАВЕ».

Зараз зразумела, чаму «Дрэваапрацоўшчык» скаўціўся да ганебных прарываў. Работа прафсаюзнай і партыйнай арганізацый **не перабудавана.** З новымі мэтадамі работы прафсаюзаў рабочыя **не знаёмы.** З боку ЦП саюзу дрэўлес кіраўніцтва вельмі слабое. Кіраўніцтва заводу ня здолела стаць на чале энтузіязму мас, а апартуністычна спадзявалася на самацёк. Вось чаму над заводам навісла чорная хмара прарыву.

А. Манькоў.

„Прамфінплян перад маімі вачыма"

КОЖНЫ РАБОЧЫ ВЕДАЕ, КОЛЬКІ АПЭРАЦЫЙ ЁН ПАВІНЕН ДАЦЬ У ГАДЗІНУ

ТАК ДАВЕДЗЕН ПРАМФІНПЛЯН ДА РАБОЧЫХ НА ШВЭЙНАЙ ФАБРЫЦЫ „КАСТРЫЧНІК"

Для пасьпяховага выкананьня прамфінпляну рашаючае значэньне мае правільнае даведзеньне прамфінпляну да кожнага цэху, брыгады і кожнага рабочага.

На фабрыцы «Кастрычнік» прамфінплян 1931 году прапрацаваны на сходах рабочых усіх агрэгатаў. **РАБОЧЫЯ АГРЭГАТАЎ УНЕСЬЛІ ШМАТ РАЦЫЯНАЛІЗАТАРСКІХ ПРАПАНОЎ І НА ІХ ПАДСТАВЕ СКЛАЛІ СУСТРЭЧНУЮ ПРАГРАМУ, павялічыўшы кантрольныя лічбы на 16 тыс. адзінак.**

У мінулым годзе прамфінплян да кожнага рабочага быў даведзен шляхам спэцыяльных картак, на якіх былі вызначаны прамфінпляны кожнага рабочага.

Гэты мэтад апраўдаў слабе толькі часткова. Праз некаторы час, калі заводзкія арганізацыі зрабілі праверку—ці сапраўды кожны рабочы ведае свой прамфінплян, то выявілася, што многія рабочыя згубілі карткі, а частка рабочых ні разу ў картку на заглядвала.

На трэці год пяцігодкі карткі ануляваны. Зараз па агрэгатах вывешваюцца вялікія плякаты, якія вызначаюць лічбы прамфінпляну агрэгату на кожны квартал, месяц, дзень і нават гадзіну.

Апрача плякатаў кожны агрэгат мае кантрольную дошку, на якой запісваюцца кожны дзень лічбы выпрацоўкі кожнай зьмены, кожнага агрэгату. Вывешваны таксама агульна-фабрычныя плякаты, на якіх паказваецца процант выкананьня прамфінпляну ўсімі агрэгатамі як па колькасных, так і па якасных паказальніках.

Новы мэтад даведзеньня прамфінпляну да агрэгату рабочыя ўсе ўхваляюць. Рабочы Грычанік кажа: «Раней я картку паглядзеў адзін раз, а потым яна сярод безлічы паперак у кішэні згубілася. Зараз перад маімі вачыма я сіць плякат і я маю магчымасьць кожную хвіліну паглядзець на мой прамфінплян».

Тое самае заяўляюць іншыя рабочыя.

Толькі закройны цэх ня мае свайго прамфінпляну, і рабочыя гэтага цэху ня ведаюць, колькі ім трэба выпусьціць прадукцыі. На пытаньне, чаму працуюць толькі 10 рабочых, а ня 8 ці 12 рабочыя адказваюць, што яны ня ведаюць. Спраўляюцца з работай—і добра.

— Колькі-ж вы павінны даваць кожны дзень?

— Колькі магу, столькі і даю...

Па думцы некаторых рабочых штат закройнага цэху вялікі. Але гэтага нельга сказаць напэўна, бо закройны цэх ня мае прамфінпляну.

Р.

Сёньня апошні дзень

НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА ТОЕ, ШТО ВОЛЬШАСЬЦЬ ЦЭНТРАЛЬНЫХ ПРАЎЛЕНЬНЯЎ САЮЗАЎ ЗССР УЖО АТРЫМАЛІ АД ЦК САЮЗАЎ ЛІМІТЫ ПА ЗАРПЛАЦЕ, ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ ПРАЦЫ І ЗНІЖЭНЬНІ САБЕКОШТУ, ЗАКЛЮЧЭНЬНЕ ЗГОД ПА КАЛДАГАВАРОХ З ГАСПАДАРЧЫМІ АБ'ЯДНАНЬНЯМІ **ЗАТРЫМЛІВАЕЦЦА** ПА ТЫХ ЦІ ІНШЫХ **НЯГРУНТОЎНЫХ ПРЫЧЫНАХ.**

МЭТАЛІСТЫ, НАПРЫКЛАД, ТЛУМАЧАЦЬ ЗАТРЫМАНЬНЕ АДСУТНАСЬЦЮ ГАСПАДАРНІКАЎ. **ШВЭЙНІКІ** НЯ ВЫРАШЫЛІ ЯШЧЭ НЕКАТОРЫХ ПЫТАНЬНЯЎ. **ТРАНСПАРТНІКІ** СКАРДЗЯЦЦА, ШТО З АДМІНІСТРАЦЫЯЙ ЧЫГУНКІ І САЮЗТРАНСУ ДЯЖКА ДАГАВАРЫЦЦА. **ДРУКАРЫ** АПРАЎДВАЮЦЦА ТЫМ, ШТО ТРЭСТ ПАЛІГРАФПРАМЫСЛОВАСЬЦІ ЯШЧЭ НЕ АРГАНІЗАВАНЫ І ТАМУ НЯМА З КІМ ПАДПІСВАЦЬ ЗГОДУ. ІНШЫЯ САЮЗЫ ПРОСТА МАРУДЗЯЦЬ. НАПРЫКЛАД, **ХАРЧАВІКІ** ЛІМІТЫ АТРЫМАЛІ, АЛЕ ЗГОДУ З БЕЛСЕЛЬПРАМАБ'ЯДНАНЬНЕМ НЕ ПАДПІСАЛІ

20 СТУДЗЕНЯ — „ДЗЕНЬ ДЫРЫЖАБЛЯ“

На вылазкі інтэрвэнтаў і здрадніцтва контр-рэвалюцыйных нацыянал-дэмакратаў адкажам разгортваньнем дырыжаблябудаўніцтва, магутным патокам сродкаў забясьпечым будаўніцтва паветраных гігантаў

Дырыжабль і яго ўжываньне

Працоўнае насельніцтва нашага краю з вялікім уздымам падхапіла заклін да набудовы дырыжабляў «Правда», «Клім Варашылаў» і «Асоавіяхім».

Можна лічыць закончаным пытаньне аб тым, ці трэба нам пачынаць будаваць дырыжаблі ці не. Пачатак дырыжаблябудаўніцтва ў СССР ужо зроблен.

Усе капіталістычныя краі шырока развілі ў сябе дырыжаблябудаўніцтва, і гэты рост дырыжаблябудаўніцтва тлумачыцца пераважна ваеннымі мэтамі.

Нядаўна наведаўшы Маскву нямецкі дырыжабль «ЛЦ—127» мае матарную групу з 5 матораў у 2650 конскіх сіл, бярэ ў паветра 40 чалавек каманды, 20 пасажыраў і 15 тон багажу, рухаецца з хуткасьцю каля 129 кілём. у гадзіну.

А Амэрыка вясной 1931 г. закапчвае будаваць дырыжаблі, матарная група якіх будзе ў 4.800 конскіх сіл на кожным дырыжаблі, акрамя каманды на борту дырыжабля будзе пераносіцца 100 пасажыраў і 20 тон грузу. Хуткасьць будзе даведзена да 150 кілём. у гадзіну.

Не адстае і Англія, якая на сваіх дырыжаблях можа перавозіць 110 пасажыраў і дваццаць тон грузу.

Для Савецкага Саюзу з яго вялізнымі прасторамі і слабой сеткай чыгуначных і шасейных дарог вялізныя перспэктывы мае разьвіцьцё паветраных зносін, асабліва з дапамогай дырыжабляў.

Ня гледячы на параўнальна разьвітае ў капіталістычных краёх дырыжаблябудаўніцтва, ні ў адным капіталістычным краі няма рэгулярных райсаў па паштовых і пасажырскіх паветраных лініях.

Пашы новыя прамысловыя раёны, аддаленыя ад цэнтру, літаральна задыхаюцца ад адсутнасьці рэгулярнай, здавальняючай сувязі. Сахаліц, Камчатка з іх вялізнымі багацьцямі, наш Паўночны краі—чакаюць дырыжабляў.

Скарыстаньне дырыжабляў у час вайны ўжо мае сваю гісторыю. У вайну 1914-18 гадоў Нямеччына шырока ўжывала дырыжаблі для бамбардаваньня ангельскага ўзьбярэжжа і Лёндану, для разьведкі ў моры мінных палёў, праходаў, высочваньня падводных лодак, аховы ўзьбярэжжаў і г. д. На падставе практыкі Нямеччыны і іншыя ваюючыя дзяржавы сталі будаваць дырыжаблі і скарыстоўваць іх у вайне.

Цяпер у сувязі з разьвіцьцём і ўдасканаленьнем дырыжабляў, узрастае і магчымасьць іх ужываньня ў ваеннай справе. Акрамя бамбардаваньня варожых цэнтраў у глыбокім тыле, аховы ўзьбярэжжаў і разьведкі ў моры, дырыжаблі могуць весьці доўгі нагляд за морам, рабіць высадкі дэсантаў у глыбокім тыле, аказваць дапамогу асаджаным і акружаным войскам, быць авіяносцам, маючы на сваім борце каля 6 самалётаў.

Мы імкнемся скарыстаць дырыжаблі ва ўмовах мірнай работы. Яны могуць прынесьці вялізную карысьць у культурна-асьветным, гаспадарным і навуковым абслугоўваньні краю. Дырыжаблі, акрамя таго, што з вялікай карысьцю могуць быць ужыты для перавозкі людзей і грузаў на далёкія адлегласьці, яны могуць рабіць навуковыя і дасьледчыя палёты, тапаграфічныя здымкі, змагацца са шкоднікамі і г. д.

Справу дырыжаблябудаўніцтва трэба разьвіць. Уздым, які ёсьць у асяродзіцы працоўнага насельніцтва, павінен сустрэць самае шырокае падтрыманьне ўсёй савецкай грамадзкасьці.

У «дзень дырыжабля» трэба шырока мабілізаваць увагу працоўных мас вакол пытаньняў разьвіцьця савецкага дырыжаблябудаўніцтва.

К. Л.

Беларускі Асоавіяхім не адстае

Цэнтральны Савет Асоавіяхіму БССР супольна з камісіяй садзейнасьці дырыжаблябудаўніцтву пастанавіў правесьці «дзень дырыжабля» 20 студзеня і намеціў рад практычных мерапрыемстваў па забясьпячэньні правядзеньня гэтай важнай палітычнай кампаніі.

Райсаветы і ячэйкі Асоавіяхіму атрымалі ўказаньні аб узмацы гэтай кампаніі з міжнарэдным і ўнутраным становішчам СССР і чарговымі гаспадарча-палітычнымі задачамі. Усе арганізацыі Асоавіяхіму стаораць у сябе камісіі садзейнасьці дырыжаблябудаўніцтву, якія і павінны будуць уцягнуць у правядзеньне «дня дырыжабля» ўсю пралетарскую грамадзкасьць, свайго прадпрыемства, установы, калгасу і саўгасу.

Цэнтральны Савет асаблівую ўвагу звяртае на прыцягненьне да правядзеньня «дня дырыжабля» ўсіх грамадзкіх арганізацый, як намсамол, профсаюзы, кооперацыя, савецкія органы, вайсковыя часьці, Аўтадор, Чырвоны крыж, т-ва прыхільнікаў радыё, Наркамасветы і г. д., з якімі Цэнтральны Савет зьвяжацца для больш пасьпяховага правядзеньня гэтай кампаніі.

Уся работа па правядзеньні «дня дырыжабля» павінна даць яснае разуменьне тай вялізарнай важнасьці, якую прадстаўляе сабой савецкае дырыжаблябудаўніцтва, і павінна выклікаць магутны паток сродкаў у агульны фонд дырыжаблябудаўніцтва.

Збор сродкаў можа праводзіцца на дырыжаблі «Правда», «Клім Варашылаў» і «Асоавіяхім» і ў агульны фонд дырыжаблябудаўніцтва.

Вялікае значэньне надае Цэнтральны Савет пытаньню правядзеньня гэтай кампаніі пад знакам сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Усе віды навочнай агітацыі, кіно, радыё,—усё павінна быць скарыстана ў «дзень дырыжабля». Для ўзмацненьня збору сродкаў Цэнтральны Савет прапануе па БССР правесьці скарбоначныя зборы, збор экспартнага уцільсырцу, пастаноўку спэктакляў, канцэртаў, арганізаваць суботнікі, што значна ўзмоцніць прытокі сродкаў у фонд дырыжаблябудаўніцтва.

Райсаветы і ячэйкі Асоавіяхіму павінны будуць шырока асьвятляць ход падрыхтоўкі і правядзеньня самой кампаніі ў раённым друку, шматтыражках і насьценных газэтах.

Усе гэтыя намечаныя мерапрыемствы і той вялізарнейшы энтузіязм працоўных Беларусі, з якім рабочая кляса БССР адгукнулася ў адказ на падрыхтоўку інтэрвэнцыі, дае ўпэўненасьць у тым, што працоўныя масы Беларусі сустрэнуць вялікім патокам сродкаў «дзень дырыжабля» і паложаць фундамант магутнага савецкага дырыжаблябудаўніцтва.

М. В.

МЕНСК

Палітэхнізацыя пачатковых школ праходзіць марудна

Калегія НКА канстатавала, што палітэхнізацыі пачатковых школ праходзіць надзвычай дрэнна. Раённыя арганізацыі не аддаюць гэтай справе належнай увагі. Некаторыя інспэктары парасьветы і частка настаўніцтва не разумеюць важнасьці палітэхнізацыі і не пераключаюцца на новыя мэтады работы.

Калегія адзначыла, што апарат Наркамасьветы, у прыватнасьці навукова-мэтадалёгічны камітэт, слаба кіруюць палітэхнізацыяй школы.

Прапанавана ўсім інспэктарам да пачатку заняткаў (пасьля зімовага перапынку) прымацаваць усе школы да прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў. Вылучана камісія па выпрацоўцы праекту закону аб палітэхнізацыі школ.

Аднадзенная газэта „МОПР“

ЦК МОПР'у БССР выпусьціў першы нумар аднадзенай газэты «МОПР», прысьвечаны кампаніі зімовай дапамогі палітзьняволеным капіталістычных турмаў і іх сем'ям, а таксама ўдзелу МОПР'у ў справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў. Газэта разаслана ва ўсе гарады і раёны БССР.

Белсампрамсаюз ня выконвае заданьня ўраду

Выраб абознага інвэнтару — саней і калёс — сканцэнтраваны ў саматужна-прамысловай кааперацыі. СНК БССР абавязаў Белсампрамсаюз загатовіць да наступленьня зімы 5.000 саней. Белсампрамсаюз гэтага заданьня не выканаў.

На працягу чатырох месяцаў вядзецца пераписка паміж Белсампрамсаюзам і Белканторай Саюзтрансу аб вырабе для апошняй 400 саней. Спачатку Белсампрамсаюз апраўдваў сваю бязьдзейнасьць адсутнасьцю жалеза. Калі-ж Саюзтранс сам дастаў жалеза і перадаў яго арцелям Белсампрамсаюзу, дык знайшлася новая «аб'ектыўная» прычына: няма палазоў.

У выніку пядбайных адносін Белсампрамсаюзу да выкананьня дырэктывы ўраду, транспарт застаўся без саней. У Бабруйску ўвесь транспарт спыніў работу. У іншых гарадох прадукцыйнасьць транспарту значна зьнізілася. Запасу саней мінулага году хапае толькі на 30-35 проц. коняй.

Пракуратура павінна неадкладна заняцца гэтай справай. Вінаватых у яе выве дырэктывы ўраду трэба прыцягнуць да адказнасьці.

Б. А.

ЗА ДЗЕНЬ

— Гарсавет прапанаваў Эльводу паскорыць распрацоўку праекту новага валаніраваду. Каналізацыйнаму аддзелу Эльводу прапанавана прыняць рашучыя меры для хутчэйшага далучэньня домаўладальніку да каналізацыйнай сеткі.

—Прэзыдыум Беларускай Акадэміі Навук пастанавіў выпусьціць газэту — шматтыражку «За пралетарскую навуку».

Ня зьніжаць тэмпаў адгрузкі дроў

Тэмпы адгрузкі дроў для Менску гнебна зьніжаюцца. Паводле даных МЦРК за 3 студзеня адгружана 93 вагоны дроў, а за 4 студзеня—толькі 63 вагоны.

Са станцыі Ельск адгружана 5 вагонаў, Бабічы—2, Калінкавічы—7, Старушкі—8, Абрамаўск—3, Пціч—2, Вятка—2, Ратміровічы—9, Брожа—9, Бабруйск—12 і Лепель—3.

Загатоўчыя арганізацыі навінны прыняць тэрміновыя меры для ўзмацненьня адгрузкі дроў. Трэба дабіцца, каб кожны дзень адгружалася для Менску ня менш 100 вагонаў дроў.

Распушчан прэзыдыум віцебскага гаркому і барысаўскі райком МОПР'у

ЦК МОПР'у БССР распусьціў прэзыдыум ВІЦЕБСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ І БАРЫСАЎСКІ РАЙКОМ МОПР'У за праявы правага апартунізму ў рабоце, за недаацэнку важнасьці мопраўскай работы, за невыстарчальнае разгортваньне крытыкі і самакрытыкі.

Барацьба з таемным забоем коняй

Цэнтральны савет Асоавіяхому БССР мабілізаваў усе арганізацыі Асоавіяхіму на барацьбу з таемным забоем коняй. Цэнтральны савет даў канкрэтныя дырэктывы ў гэтым напрамку ўсім раённым саветам Асоавіяхіму. Раённыя саветы ў сваю чаргу мабілізуюць вакол гэтай задачы ячэйкі Асоавіяхіму на прадпрыемствах.

Каэтэра „пра запас“

Дзесяткі рабочых і адказных работнікаў не даюць спакою акцыянэрнаму таварыству «Домстрой».

— Можа пакойчык ёсьць, таварышы? — пытаюцца наведвальнікі.

— Каэтэры ў нас няма, — адказваюць спакойна праўленцы.

А ў той-жа час у доме Камунбанку каля пяці месяцаў пустуе кватэра з 10 кв. саж.

Гэту кватэру займаў былы работнік ВОНТБ, тав. Сасноўскі. У пачатку чэрвеня мінулага году ён быў адкамандыраваны ў горад Барысаў, дзе працуе і зараз сакратаром райкому партыі. Тав. Сасноўскі атрымаў кватэру ў Барысаве, пераезд туды сям'ю, а кватэру ў Менску замацаваў за сабою. Такім чынам, тав. Сасноўскі мае дзьве кватэры: адну ў Барысаве, другую—у Менску. Апошняя заўсёды знаходзіцца пад замком. Між тым, патрэба ў каэтэрах для рабочых вельмі востая.

У гэтым-жа доме жыве рабочы з вялікай сям'ёй ў маленькім праходным пакойчыку. На шматлікія заявы праўленню «Домстроя» і асабіста старшыні праўленьня аб гэтым ненармальным зьявішча адказу няма. Ва ўмовах жыллёвага крызісу зьяўляецца злачынствам, калі кватэра, у якую можна пасяліць 2 рабочыя сямі, знаходзіцца пад замком і нікім не выкарыстоўваецца. Адведным арганізацыям трэба заняцца гэтым пытаньнем.

А. С.

Па Савецкай Беларусі

Т. т. Рак-Міхайлоўскі, Бурсэвіч і Грэцкі—у Гомелі

ГОМЕЛЬ. (Наш кар.). 29 сьнежня ў Гомель прыехалі т. т. РАК-МІХАЙЛОЎСКІ, БУРСЭВІЧ І ГРЭЦКІ. Яны наведалі рад прадпрыемстваў Гомелю, у тым ліку СЕЛЬМАШ, швэйную фабрыку «КАМІНЭРН», завод ІМЯ ЛАНЦУЦКАГА, завод «ПРАЛЕТАРЫ» і інш. На ўсіх прадпрыемствах у гонар гасьцей адбыліся ляўчыя мітынгі. Рабочыя заводаў арганізавалі збор сродкаў у фонд зімовай дапамогі палітзьняволеным капіталістычных турмаў. На швэйнай фабрыцы было сабрана больш за 100 руб., на заводзе «Пралетары» — звыш 200 руб. і г. д.

31 сьнежня т. т. Рак-Міхайлоўскі, Бурсэвіч і Грэцкі наведалі гомельскую электрастанцыю і прынялі ўдзел у інтэрнацыянальным вечары фабрыкі «Праца».

Пачаўся збор мэталалому

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). На прадпрыемствах Барысава пачаўся збор мэталалому. На фабрыцы «Чырвоная Барэзіна» піянэры сабралі каля 10 тон лому, на фабрыцы «Камінтэрн»—6 з паловай тон. Шмат лому сабрана рабочымі-будаўнікамі.

Слабы ўдзел у зборы мэталалому прымаюць гута імя Домбаля, фабрыкі «Рабочы» і «Прафінтэрн». Фабзаўкомы і ячэйкі ЛКСМБ гэтых прадпрыемстваў нічога ня робяць для арганізацыі збору.

Кампанія—пад пагрозай

ЖЛОБІН. (Наш кар.). Справаздачна-перавыбарчая кампанія гарсавету не адчуваецца ў горадзе. Мясцовыя арганізацыі дрэнна падрыхтаваліся да перавыбараў.

Клюбы і чырвоныя куткі—ў баку ад перавыбараў. У клюбах не праводзіцца ніякай работы вакол важнейшай палітычнай кампаніі дня. У клюбе чыгуначнікаў няма нават лёзунгаў, прысьвечаных перавыбарам. Справаздачныя сходы на чыгунцы ня зьвязваюцца з задачамі ліквідацыі прарываў на транспарце.

М-і.

Новы кіно-тэатр

МАГІЛЕЎ. (Наш кар.). 24 сьнежня ў Магілеве адкрыўся новы кіно-тэатр «Чырвоная Зорка». Тэатр быў пабудован за 6 з паловай месяцаў. Ва ўрачыстым адкрыцьці тэатру прыняло ўдзел звыш 700 дэлегатаў з прадпрыемстваў Магілева. З прывітаньнямі выступалі прадстаўнікі РК КП(б)Б, райпрафсавету, гарсавету, чырвонаармейскіх часьцей і прадпрыемстваў гораду. На гэтым-жа пасяджэньні былі прэміраваны лепшыя рабочыя-будаўнікі і работнікі мастацтва.

„Дробязі“

На Рэчыцкай запалкавай фабрыцы «Дняпро» культурна-бытавое абслугоўваньне рабочых начной зьмены вельмі нездавальняючае. Загадчыкі цэхаў у большасьці вылучэнцы, ім патрэбна дапамога як з боку адміністрацыі, так і грамадзкіх арганізацый. Але гэтага яны не атрымліваюць.

— У нас часта бываюць прастоі з-за дробязі, — гаворыць загадчыца цэху тав. Абрамовіч. — Напрыклад, няма яшчэ для чысткі машын, а ў часе начной зьмены няма каму іх выдаць. Часта бывае так, што рабочы прыходзіць на трэцюю зьмену, але адміністрацыя не падрыхтавала для яго работы і ён па 7 гадзін нічога ня робіць.

З прычыны адсутнасьці тэхнічнага кіраўніцтва, брак у часе начных зьмен даходзіць да надзвычайных разьмераў. Адміністрацыя аб гэтым ведае, але яе гэта чамусьці мала трывожыць.

Нядаўна наладжана харчаваньне начной зьмены. Але часта не хапае абеду.

Адміністрацыя і фабком павінны перабудаваць сваю работу, начныя зьмены трэба абслугоўваць таксама як і дзённыя.

КАРОБАЧНЫ.

У шчотачнікаў можна павучыцца

Для падшуканьня лепшай формы давядзеньня прамфінпляну да кожнага рабочага, на шчотачнай фабрыцы імя Крупскай (Менск) быў абвешчан конкурс. У выніку конкурсу была ўхвалена прапанова плянавіка фабрыкі тав. Юдзялевіча. Напярэдадні ўступленьня ў трэці год пяцігодкі прапанова гэта была ажыцьцёўлена.

Адміністрацыя надрукавала спэцыяльныя кніжкі для кожнага рабочага. У гэтых кніжках надрукаваны кольксныя і якасныя паказальнікі агульна-фабрычнага прамфінпляну, а таксама прамфінпляны кожнага цэху і кожнага рабочага.

З 1-га студзеня старшы брыгадзір кожны дзень запісвае ў кніжкі пропанты выкананьня прамфінпляну кожным рабочым. Старшы майстар цэху адзначае на кантрольных дошках, якія вісяць у кожным цэху, выкананьне прамфінпляну па ўсім цэху.

Рабочыя ўхваляюць гэты метад давядзеньня прамфінпляну.

Між іншым, у кніжках ёсьць спэцыяльная графа, якая запаўняецца тады, калі рабочы ня выконвае свайго прамфінпляну. У гэту графу ён піша прычыны невыкананьня прамфінпляну і тут-жа запісвае свае прапановы для зьнішчэньня гэтых прычын.

І.

На што хварэе бабруйская швэйная фабрыка

10 дзён, як бабруйская швэйная фабрыка абвясьціла штурм прарыву. Але кароннага пералому яшчэ няма. За першую пяцідзеўку штурму фабрыка выканала праграму на 79,5 проц., а за другую пяцідзеўку—на 86,2 проц. Гэта —па кантрольных апэрацыях. Калі-ж лічыць па здачы на склад, дык праграма выканана толькі на 77,7 проц. Яшчэ горш з якасьцю прадукцыі. Па агульным прызнаньні, яна надзвычай дрэнная.

Кантрольныя брыгады, вылучаныя ў сувязі з генэральным агляданьнем, выяўляюць штодзённа шмат непаладак.

Каманднае склад фабрыкі — інструктары, кантралёры і інш. да гэтага часу ня сталі запраўднымі арганізатарамі і кіраўнікамі цэхаў. У агрэгатах наглядаецца шмат выпадкаў парушэньня працыцыплінны. Значная частка прадукцыі перарабляецца. Дае-ж пільнае вока інструктара, які абслугоўвае ня больш 20 чалавек?

Рацыяналізатарская работа пастаўлена вельмі дрэнна. Пасобныя прапосы работы ня вывучаны. У выніку адны апэрацыі перагружаны, другія недагружаны. Ёсьць апэрацыі, якія можна лёгка ліквідаваць і зьліць з іншымі. Да апошняга часу гэтай справай сур'ёзна не займаліся.

Цэхавыя арганізацыі не раскачаліся. Яны не палучыліся тут-жа на-баяному рэагаваць на усе нездаровыя зьявішчы. Першая істужка правальнае выкананьне плану. А інструктар Гарбачаўскі заяўляе: «Рэзэрвнікамі плян ня выкананы».

Марудна раскачваюцца цэхавыя трыкутнікі і ў правядзеньні генэральнага агляду. Характэрны факт. У самы разгар штурму, загадчык вытворчасьці, загадчык бюро рацыяналізацыі і начальнікі інструктароў былі камандыраваны на экскурсію і дагэтуль не вярнуліся. Гэтым значна аслаблена кіраўніцтва штурмам.

Як магло кіраўніцтва фабрыкі дапусьціць такое галавацяпства?

А. Магідаў.

Паведамленьні

ТАВАРЫСТВА ЭКАНАМІСТАЎ МАРКСЫСТАЎ І ІНСТЫТУТ ЭКАНАМІЧНЫХ ДОСЬЛЕДАЎ

6-га студзеня а 6-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні Дзяржпляну (Пляц Волі № 5, зала насяджэньняў) адбудзецца аб'яднанае пасяджэньне Таварыства эканамістаў, марксыстаў сумесна з Інстытутам Эканамічных Досьледаў пры Дзяржпляне БССР.

У парадку дня: Даклад праф. Вайсмана.

СЕНЬНЯ:

Клюб нав. прац.: Вечар вядомага гэнія-калькулятара Араго.

Пач. у 9 гадзін вечара. Уваход вольны.

ЗАЎТРА:

Клюб нав. прац.—у 8 з паловай гадз. веч. пасяджэньне савету клюбу. Яука гл. савету абавязкова.

Сьпіс дакладчыкаў Гаркому КП(б)Б па правядзеньні 7-1—31 г. дакладу аб выніках сьнежаньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б):

Зав. «Камунпар»—Будзінскі, ф-ка «Кастрычн.»—Дунец, зав. «Дрэваапрацоўшчык»—Фрыдман, друк. «Сталіна»—Некрашэвіч, зав. «Беларусь»—Лынькоў, ф-ка «Камунарка»—Курціц, «Беларуска»—Любін, фугравая—Саевіч, шпалерная—Агульнік, «Чыр. тэх»—Красіна, Хлебзавод—Гольдбэрг, Эльвод — Хацкевіч, п.-к. «Уціль»—Шынднер, Белдзяржбуд—Абрамсон, Менбуд — Розін, ф-ка рымароў — Гаўскі, буд. ад МЦРК —Альперовіч, пажарная—Шчацько, Гар жыльсаюз—Верба, Аўтакіраўніцтва—Ядкевіч, казан. прадпрыемств. харчав.—Сяргееў, сталовая МЦРК—Кумкес, зав. «Пралетары»—Будзін.

Сакратаром ячэек прапануецца дагаварыцца з дакладчыкамі наконт дакладаў.

Агітмасавы аддзел Гаркому КП(б)Б склікае 10 студзеня ў 6 гадзін вечара ў памяшканьні залі пасяджэньняў гаркому пашыраную нараду агітмасавага актыву гораду з наступным парадкам дня: 1. Прамфінплян і задачы агітмасавай работы. Аб правядзеньні ленінскіх дзён.

На нараду павінны зьявіцца: масавыя прадаўнікі парткалектываў, яцэек і цэхячэек, культмасавыя прадаўнікі ФЗМК (камуністы), рэдактары шматтыражак і насьценгазэт (камуністы).

Яука абавязкова і без спазьненьня.

Арг. інструктарскі аддзел гаркому склікае 6 студзеня ў 6 гадзін вечара ў памяшканьні гаркому (зала пасяджэньняў) нараду сакратароў ячэек і старшынь ФЗМК з парадкам дня: 1. Аб ходзе справаздачнай кампаніі гарсавету, 2. Інфармацыя аб паверачным зборы.

У зьвязку з важнасьцю пытаньня яўка сакратароў ячэек і старшынь ФЗМК абавязкова і без спазьненьня.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Рэдакцыя і гаспадарчая кантора Менск, Савецкая, 63.

ТЭЛЕФОНЫ:

Рэдактар	13-50	Начны рэдактар	6-42
Сакратар	10-74	Галоўная кантора	7-31
Сэктар інфармацыі	6-19	Аддзел рэкляміі	7-31
		„ абвестак	7-31

Умовы падпіскі (з дэрэвовым дадаткам „Прафрух“)

На 1 мес.	— 93 к.
„ 3 мес.	2 р. 83 к.
„ 6 мес.	5 р. —
„ 12 мес.	9 р. 75 к.

Падпіска прымаецца ўсюды на пошце.

Плата за абвесткі:

За радок пошп. памеру тэксту—50 к., пашы гарадзкія абвесткі—1 р. за радок. Пасярэд тэксту—т два разы дарожэй. Пры прыцягненьні дружаньні—скідка. Зьмы тарыфу згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. б. рэшта 10 проц. падатку.

Абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газэты «ЗЬВЯЗДА» Менск, Савецкая, 63, 2-ой паверх, тэл. 7-31.

Гукавы кіно-тэатр „Чырвоная Зорка“ З панядзелка, 5-га студзеня

вядомыя артысты Бернгард Гетцке, С. Магарыч, М. Сіманіна, І. Чувелаў, Г. Мічурын

У МАСТАЦКІМ ФІЛЬМЕ

ГАРАДЫ І ГАДЫ

Драма ў 9 частках (паводле аднайменнага раману К. ФЕДЗІНА)

ХРОНІКА САЮЗКІНО № 69

Звыш праграмы: ГУКАВЫ КІНО-КАНЦЭРТ

Штодзённа тры сэансы

ПАЧАТАК: у 7, 8 г. 45 хв. і 10 г. 30 хв.

Каса адкрыта з 5 г. вечара.

КІНО-ТЭАТР „Культура“ З панядзелка, 5 студзеня

Новы нямецкі фільм вытворчасьці 1930 г.

Нявольнікі бледнай гары

Драма ў 7 частках

Рэжысэры: А. Фанк і Г. Пабст

У галоўных ролях: Лені Рыфэншталь, Густаў Дысэль, Эрнст Пэтэрсен, Эрнст Удэт, вядомыя па нарцінс „Горная баляда“.

Звыш праграмы: ХРОНІКА САЮЗКІНО № 62.

Пачатак сэансаў у 7 г., 8 г. 40 хв. і 10 г. 20 хв.

КАСА АДКРЫТА З 5 ГАДЗІН.

Асобы, якія спазьняюцца, на сэанс не дапускаюцца

Паведамленьні ў чарговы нумар „ЗЬВЯЗДЫ“ прымаюцца да 2 гадз. дня

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“ З ПАНЯДЗЕЛКА, 5 СТУДЗЕНЯ

ІГАР ІЛЬІНСКІ А. Кторай і Н. Стрижова — у ленінай камэры сэкону —

СЬВЯТА СЬВЯТОГА ІЕРГЕНА

ў 7 частках.

Штодзённа 4 сэансы: Пачатак 1 сэансу—6 г., 2-га—7 г. 30 м., 3-га—9 г. і 4-га—10 г. 30 м.

Каса адкрыта з 4 г. вал. гадз.

Белдзяржкіно Другі Дзяржаўны тэатр

Для дэлегатаў зьезду ЦК ЛКСМБ

Сёньня, 5 студзеня

„ПЕРШАЯ КОННАЯ“

Пачатак у 9 гадз. увечары.

Кіно „ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ“

З панядзелка, 5-га студзеня

З ПРЫЧЫНЫ ВЯЛІКАГА ПОСЬПЕХУ

2-гі тыдзень пастаноўкі 2-гі

гістарычны раман

ПАЭТ І ЦАР

У галоўных ролях: Б. Тамарын, Худалеєў, Чар ная, Вазовська і іншыя.

Пачатак 1 сэансу ў 6 гадз.

Каса—з 4 г. 30 хв.

Кіно „СПАРТАК“

З панядзелка, 5 студзеня бытавы фільм

„ПАЛАЧЫ“

ў 7 частках з прыёмам

УВАГА: штодзённа 4 сэансы УВАГА

Пач. сэансаў: 1 с.—6 г. 30 хв., 2 с.—8 г., 3 с.—9 г. 30 хв. і 4 с.—11 г.

Каса з 5 гадз.

КІНО „ЮНЫ ПІЯНЭР“ 2-га—у 2 г. 45 хв.

З панядзелка, 5-га студзеня 1-я серыя „ЧЫРВОНЫЯ Д'ЯВАЛЯТА“

Кіно-аповесьць у 2-х частках—12 частак

Пачатак першага сэансу ў 1 г. дня.

Каса адкрыта з 12 г. дня.

Клюб імя КАРЛА МАРКСА

7 студзеня

АПОШНІ КАНЦЭРТ

— віртуозаў —

піяніст ЮРЫ БРУШКОЎ

скрыпач Самуіл ФУРЭР

партыю роялю выконвае Л. І. Файнштэйн.

Праграма канцэрту зусім новая.

Білеты продаюцца выключна ў рабочай касе з 12 да 2 і з 4 да 6 гадз. дня, а ў дзень канцэрту з 6 гадз. у клюбе Карла Маркса.

Пач. роўна ў 8 з пал. гадз.

ЦЭНТРАЛЬНАЯ КАЛГАСНАЯ ШКОЛА АДКРЫВАЕЦЦА з 10 студзеня 1931 г.

Усе залічаныя слухачамі павінны зьявіцца ў гор. Менск, Савецкая, 70 Белкалгасцэнтр.

БЕЛКАЛГАСЦЭНТР.

З прычыны адсутнасьці лінейнай і станцыйнай ёмкасьці, далейшая ўстаноўка тэлефонаў СПЫНЕНА.

Паданыя заявы будуць выкананы толькі пасьля адчыненьня АТС.

Просьба да ўсіх устаноў свячасова паведамляць станцыю аб зьяніцьці тэлефонаў, вострая патрэба ў якіх мінавала.

Даводзіцца да ведама ўсіх спэцыялістаў Народнае Гаспадаркі

пто. згодна пастановы Прэзыдыуму ЦВК БССР ад 25-XI-30 году, абвешчанае ў газэце „Звязда“ ад 28-XII—30 і ў газэце „Савецкая Беларусь“ ад 25-XI—30 г.,

адбываецца з 5-I па 1-II—31 году

пэсавальны перавучот усіх спэцыялістаў па г. Менску

кіраўніцтвам надрамі г. Менску (у памяшканьні Біржы Працы)

з 1-ай гадзіны дня да 4-ай гадзіны дня ўключна ў альфабэтным парадку:

6	студзеня—на літару А	17—18 студзеня—на літару Н, О	
6—7	„ „ Б	19	„ П
8	„ „ В	20	„ Р
9—10	„ „ Г	21—22	„ С
11	„ „ Д, Е, Ж	23	„ Т, У, Ф
12	„ „ З, І	24	„ Х, Ц, Ч
13—14	„ „ К	25—26	„ Ш
15	„ „ Л	27—28	„ Щ, Э, Ю, Я
16	„ „ М	29—30—31	усе спазьнішыяся.

Яўка ўсіх спэцыялістаў абавязкова.

Заг. кіраўніцтва надрамі гор. Менску СЬМЕЛЬЦ.

Кошт публікацыі аб згубе 1 дакумэнту 1 р.

АГІТМАСАВЫ АДДЗЕЛ ГАРКОМУ КП(б)Б

склікае 5 студзеня ў 6 гадз. веч. у памяшк. залі пасяджэньняў гаркому (3-ці паверх)

НАРАДУ,

на якую павінны зьявіцца ў абавязковым парадку заг. клюбаў і ленкутоў па пытаньні: падрыхтоўка клюбаў да справаздачна-перавыбарчай кампаніі саветаў.

Усім загадчыкам клюбаў падрыхтаваць матэрыялы па гэтым пытаньні.

Сацыяльна-бытавы сэктар ЦСПСБ

СКЛІКАЕ

5-І а 7-й гадзіне ўвечары нараду па пытаньні «Аб дзейнасьці Інстытуту Аховы Працы пры НКП БССР» (Дакладчык—дыр. інстытуту С. Р. Дзікшэр).

На нараду выклікаюцца кіраўнікі сан. бытавых сэктараў ЦП саюзаў, фабзавкомаў, прадстаўнікі НКПраці, ВСНГ, НКАдароўя, НКЗему, Навукова-дасьледчых устаноў і паступныя т. т.:

Бакштэйн Е. М., Хмельніцкі І. І., Доломінкі М. Б. Фрыдман Н. А., Скорабагаты М. І., Галіоўскі І. Е. Хчаўновіч М. Ш., Чарноўскі Е. Г., Левін Г. І., Лебін А. Я., Крывашэеў А. І., Еўлінкоўскі Н. Ф. Гольцэ, Ледэр, Бабгаўз, Шульман А. М., Салдлер В. М., Протасе Е. В., Арлюк А. А., Загельштэйн С., Цітвер І. Г., Курган Д. Я., Файсінаў І. М., Зуеўскі В. К., Крупса Н. Н., Бараў Я. М., Ружынскі, Вальфсон, Чарнікоў К. В., Кавтар М. А., Рохкінд Ф. Ш., Жукаборскі С. І., Нісенс Р. З., Бурштэйн Ф. Г., Сагаловіч А. Х., Доўнар Ф. Ф., Эстэркін В. Ф., Майзель Н. А., Шайкоўскі А. С., Кабакоў І. Х., Гітлер і Паўлоў.

Яука усіх абавязкова.

Нарада адбудзецца у залі пасяджэньняў ЦСПСБ, пакой 10.

Завочныя бухгальтарскія курсы

Прыём слухачоў праводзіцца кругла год. Прымаюцца асобы з 17-гадовым узростам з асьвятай ня ніжэй 5 гр. 7-годкі

ПЛАТА ЗА КУРС 33 РУБ.

праводзіцца так: 9 руб. пры паступленьні на курсы, а ніх 4 руб. залічваецца за 8-м месяц на 4 руб. на працягу 6 месяцаў у пачатку кожнага навучальнага месяца.

Заявы, запытаньні і грошы накіроўваць на адрас:

Менск, кошта, скрынка 44, Завочныя курсы

На адказ прыкладаць 2 маркі на 10 кап.

Прымаецца падпіска на 1931 год

на навукова-дасьледчую, навукова-популярную масавую краязнаўчую часопісь

„САВЕЦКАЯ КРАІНА“.

„Савецкая краіна“—навукова-дасьледчая, навукова-популярная, марксыцка-ленінская краязнаўчая часопісь—зьмяшчае артыкулы навукова-дасьледчага, навукова-популярнага, палітычна-масавага, ну ліцэратычнага, апісальнага характару, а таксама краязнаўчыя нарысы, марксыцка-ленінскую крытыку, рэцэнзіі і бібліяграфію.

„Савецкая краіна“—магутны барацьбіт за марксыцка-ленінскую ідэалёгію, за дыялектычны мэтад Маркса-Леніна ў краязнаўстве і навуцы, магутны барацьбіт за генэральную лінію камуністычнай партыі.

„Савецкая краіна“—вялічны экватар з вялікімі марксызму-ленінізму плынямі ў краязнаўстве і навуцы, ставячы вялічны вызваўчы змагацца в контр-рэвалюцыйным беларускім нацыянал-дэмакратызмам, за пралетарскую навуку і культуру, за савецкае краязнаўства.

„Савецкая краіна“ ставіць задачай набліжэньне шырокіх мас на дасягнаньне навуковае дасьледваньне продукцыйных сіл БССР у інтарэсах сацыялістычнага будаўніцтва і на непасрэдны ўдзел у гэтым будаўніцтве.

„Савецкая краіна“—за савецкае краязнаўства.

„Савецкая краіна“—за перабудову ўсёй краязнаўчай працы на новых вытворчых асновах. Кожны завод, кожная фабрыка, кожны саўгас, калгас—даюць краязнаўчыя ячэйкі для вывучэньня продукцыйных сіл у інтарэсах пасьпяховага сацыялістычнага будаўніцтва.

„Савецкая краіна“—арментуецца на масы, вага краязнаўцу. Партыйны і камсамольны, беспартыйны рабочы-калгаснікі, батракі, бедота і лепшая частка сераднякоў, студэнцтва, вучыцельская моладзь, вясковая і гарадзкая інтэлігенцыя, адданая справе сацыялістычнага будаўніцтва—актыўна пішуць у часопісь вакол краязнаўчых дэпэш.

Часопісь „САВЕЦКАЯ КРАІНА“ выходзіць раз у месяц.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: На год—4 р.; на 9 мес.—3 р. 25 к.; на паўгода—2 р. 25 к.; на 3 мес.—1 р. 25 к.; на 1 мес.—50 к.

Падпіска з кожнага месяца.

Падпіска